ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

18 СНЕЖНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 240 (27850) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ён падаў у кратар вулкана...



Навошта інспектару ДАІ «Страла»?



Шах і мат ад Ланіты

# Заззяла «Калядная зорка»

Учора ў сталіцы адкрылася XVIII рэспубліканская выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў «Калядная зорка». Са сваімі творамі на яе з'ехаліся дзеці і падлеткі з усёй краіны — пераможцы рэгіянальных адборачных тураў. Прастору для фантазіі ва ўдзельнікаў — хоць адбаўляй: на тэмы «Зіма», «Раство Хрыстова», «Новы год», «Каляды» яны ткалі, вышывалі, малявалі, плялі з саломкі, рабілі выцінанкі, майстравалі лялек, ёлачныя цацкі і паштоўкі. Выстава праходзіць у выставачнай зале Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. А лепшыя творчыя работы будуць уключаны ў экспазіцыю выставы на навагоднім дабрачынным свяце «Нашы дзеці».



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Артур КАРПОВІЧ, першы намеснік міністра гандлю:**

*«Яшчэ не так даўно адзначалася паступовае змяншэнне долі тавараў айчыннай вытворчасці, якія рэалізуюцца нашымі крамамі. Доля беларускай прадукцыі ў агульным аб'ёме знізілася з 80% у 2005 годзе да прыкладна 69% у 2013-м. Гэта быў нядобры знак, які паказваў, што мы свой унутраны рынак губляем. У адпаведнасці з даручэннямі Прэзідэнта і Савета Міністраў, Мінгандлю надаў гэтаму пытанню асаблівую ўвагу, і, пачынаючы з 1-га квартала 2014 года, нам удалося паламаць негатыўную тэндэнцыю. Дынаміка наяўнасці тавараў айчыннай вытворчасці пайшла ўверх. Цяпер сітуацыя змянілася, і сёння ў цэлым па краіне рэалізуецца амаль 72% тавараў айчыннай вытворчасці».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10880,00 | ▲ |
| Еўра | 13590,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 163,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 682,77 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ На карысць спажыўца

# ЗАКРЫЦЦЁ — НЕ САМАМЭТА

## Але неабходна прымусіць несумленных суб'ектаў гаспадарання прытрымлівацца заканадаўчых нормаў

**5 снежня Прэзідэнт краіны падпісаў Указ №567 «Аб дадатковых мерах па абароне правоў спажыўцоў», які надзяляе намесніка міністра аховы здароўя — галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Беларусі дадатковымі паўнамоцтвамі па кантролі за вытрымліваннем санітарных нормаў і правілаў у галіне рознічнага гандлю і грамадскага харчавання. Прадугледжваецца таксама перадача ад Міністэрства эканомікі Міністэрству гандлю паўнамоцтваў на рэгуляванне і кантроль цэнаўтварэння на асобныя спажывецкія тавары (работы, паслугі). Міністр гандлю надзяляецца правам прымаць рашэнні аб абароне правоў спажыўцоў і грамадскага харчавання ў выпадку невыпраўлення фактаў парушэння заканадаўства аб цэнаўтварэнні, гандлі і грамадскім харчаванні. Дакумент канцэнтруе ў Міністэрстве гандлю і дзяржаўнай санітарнай службе функцыі, якія падтрымліваюць парадак на ўнутраным спажывецкім рынку, вытрымліванне санітарных нормаў і правілаў вядзення рознічнага гандлю, грамадскага харчавання і цэнаўтварэння.**

СТАР. 4

■ Медыяпрастора

# ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСЫ ПРЫРАЎНЯЛІ ДА СМІ

**Учора Палата прадстаўнікоў прыняла ў першым і другім чытаннях праект закона Рэспублікі Беларусь аб унясенні змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сродках масавай інфармацыі». Сёння гэты законапраект разглядаецца ў Савеце Рэспублікі.**

Навацыя праекта — у распаўсюджванні дзеяння Закона аб СМІ на інфармацыйныя рэсурсы (іх складнікі), размешчаныя ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, на якіх размешчана прадукцыя СМІ, за выключэннем патрабаванняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

«Робіцца гэта з мэтай забеспячэння канстытуцыйнага права грамадзян на атрыманне найбольш поўнай і праўдзівай інфармацыі, з мэтай абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, а таксама з мэтай забеспячэння нацыянальнай бяспекі ў інфармацыйнай сферы», — падкрэсліла **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Адно з самых галоўных патрабаванняў законапраекта датычыцца адказнасці ўладальнікаў інфармацыйных рэсурсаў за размешчаныя на іх рэсурсах змест.

СТАР. 2

# АСНОВА ПОСПЕХУ — УПАРТАЯ ПРАЦА

### Мы не адмовіліся ад сваіх прынцыпаў добрасуседства, захавалі мір і стабільнасць у грамадстве

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод, якая напярэдадні калядных і навагодніх свят ужо стала добрай традыцыяй, паколькі канец года — гэта час падвядзення вынікаў, паведамляе БЕЛТА.**

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, беларусы годна пражылі год, хоць і не абышлося без цяжкасцяў і праблем. Многага ўдалося дасягнуць менавіта дзякуючы таму, што ў грамадстве захаваны мір і стабільнасць. Сабраны нядрэнны ўраджай збожжавых і іншых культур, забяспечана харчовая бяспека краіны. Уведзены ў строй новыя і мадэрнізаваныя прадпрыемствы, у выніку чаго прамысловы патэнцыял павялічаны амаль на паўтары тысячы арганізацый. «У беларускай сталіцы і рэгіёнах за год пабудаваны жылыя масівы і сацыяльна-культурныя аб'екты. Упершыню за ўсю гісторыю сучаснай Беларусі мы прымалі ў сябе буйное міжнароднае першынство — чэмпіянат свету па хакеі», — дадаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што Беларусь сваімі дасягненнямі абавязана тым, хто ўпарта працуе, каб зрабіць наша жыццё лепшым. Дзяржаўных узнагарод удастоены прадстаўнікі розных прафесій. Сярод узнагароджаных — прадстаўнік аднаго з флагманаў айчыннага машынабудавання і сусветна вядомага беларускага брэнда — адкрытага акцыянернага таварыства «БелАЗ». Аграпрамысловы комплекс на мерапрыемстве прадстаўляў кіраўнік філіяла «Сервалюкс Агра» сумеснага закрытага акцыянернага таварыства «Сервалюкс» Магілёўскага раёна. Словы падзякі Прэзідэнт адрасаваў беларускім будаўнікам, у прыватнасці, калектывам «Гроднажылбуда», Бяльніцкай перасоўнай механізаванай калоны № 241, Брэсцкага будаўнічага трэста № 8, Мінскага ўпраўлення механізацыі № 79.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў таксама дасягненні медыцынскіх работнікаў, адказную працу супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў, прадстаўнікоў Узброеных Сіл і МНС. Ганаровых званняў і дзяржаўных узнагарод удастоены таксама вядучыя педагогі, работнікі СМІ, дзяржаўныя служачыя і дзеячы культуры. Адзначаны поспехі беларускай вышэйшай адукацыі. Аддадзена даніна павагі і тым, хто праслаўляе Беларусь спартыўнымі дасягненнямі.

Прэзідэнт падзякаваў усім за шматгадовую карпатлівую працу і адказнае стаўленне да справы, за тое, што людзі свае таленты і здольнасці выкарыстоўваюць на карысць Радзіме.

# З ПАЗІЦЫІ ДЫЯЛОГУ

### Прэзідэнт Беларусі разлічвае, што Еўропа будзе разумна падыходзіць да адносін з постсавецкімі краінамі, перш за ўсё з Расіяй

**Пра гэта Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Фонду міжнароднага супрацоўніцтва Рамана Продзі, паведамляе БЕЛТА.**

«Улічваючы, што мы з вамі еўрапейцы, што нашы краіны знаходзяцца ў Еўропе, мы вельмі зацікаўлены ў нармалізацыі адносін з нашымі еўрапейскімі партнёрамі. Але вы павінны дакладна разумець, што мы гатовы да гэтай нармалізацыі на ўзаемапаважлівых прынцыпах, гатовы на прынцыпах раўнапраўя грунтаваць нашы адносіны», — сказаў беларускі лідар.

«Мы абсалютна, дарэчы, як і вы, не прымаем мову санкцый і разлічваем, што Еўропа будзе разумна падыходзіць да адносін з рэспублікамі былога Савецкага Саюза, і перш за ўсё — з Расійскай Федэрацыяй. Нельга тут нам дзейнічаць з пазіцый санкцый, пагроз і гэтак далей. Сучасны свет гэтага не цярпіць», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў думку, што фонд, які заснаваў Раман Продзі, пасадзейнічае вырашэнню многіх пытанняў міжнароднага парадку дня.

Гаворачы пра двухбаковыя беларуска-італьянскія адносіны, Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на высокі ўзровень супрацоўніцтва. Па выніках мінулага года тавараабарот паміж Беларуссю і Італіяй склаў каля $2 млрд. «Улічваючы, што вы нямала зрабілі для Італіі, павінен сказаць, што тыя асновы супрацоўніцтва, якія былі закладзены ў тым ліку і ў ваш час, далі магчымасць сёння выйсці на сур'ёзны ўзровень тавараабароту, — сказаў беларускі лідар. — Таму ў мяне ёсць падставы падзякаваць вам за тыя намаганні, якія былі прыкладзены вамі ў свой час па нармалізацыі адносін з Беларуссю, паглыбленні гэтых адносін».

# ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСЫ ПРЫРАЎНЯЛІ ДА СМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Інтэрнэт-рэсурсы, якія распаўсюджваюць прадукцыю СМІ, дэ-факта — сродкі масавай інфармацыі. Закон замацоўвае за ўладальнікамі інфармацыйных рэсурсаў абавязак не дапускаць выкарыстання сваіх інфармацыйных рэсурсаў для распаўсюджвання інфармацыі, змест якой супярэчыць патрабаванням заканадаўства», — патлумачыла Лілія Ананіч.

Такім чынам, прынцыпы дзейнасці СМІ, замацаваныя ў артыкуле № 4 адпаведнага закона (праўдзівасць, законнасць, павažанне правоў і свабод чалавека, разнастайнасць думак, развіццё нацыянальнай культуры, абарона маралі, захаванне нормаў прафесійнай этыкі журналістаў) распаўсюджваюцца на інтэрнэт у Беларусі.

Абвяржэнне інфармацыі, распаўсюджанай у інтэрнэце, прапануецца ажыццяўляць на тым жа інфармацыйным рэсурсе, на якім была размешчана недакладная інфармацыя, не пазней за дзень, які ідзе за днём паступлення патрабавання аб абвяржэнні. Пры гэтым інфармацыйнае паведамленне або матэрыялы, якія абвяргаюцца, выдаляюцца.

У выпадку вынясення ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу ў інтэрнэце па працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў з боку Міністэрства інфармацыі, прадугледжваецца абмежаванне доступу да гэтага рэсурсу. Парадак такога абмежавання будзе вызначаны спецыяльна ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у сферы бяспекі выкарыстання нацыянальнага сегмента інтэрнэту сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Беларусі.

«Прапанаваныя змены ў частцы інтэрнэту стануць дзейсным інструментам рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі», — лічыць міністр.

Разам з адказнасцю для ўладальнікаў інтэрнэт-рэсурсаў, законапраект прапісвае і правa на атрыманне адпаведнага статусу журналістамі, якія працуюць на гэтыя рэсурсы. Размова ідзе пра магчымасць акрэдытацыі і атрымання інфармацыі.

«Я лічу, што гэта поспех дзяржавы — калі нацыянальная інфармацыйная прастора пачынае актыўна рэгулявацца законам, бо мы бачым, што інтэрнэт мае далёка не толькі пазітыўны фактар у развіцці грамадства і дзяржавы, але нясе ў сябе шмат небяспекі і пагроз, — сказала журналістам міністр інфармацыі.

Закон аб СМІ быў прыняты яшчэ ў 2008 годзе, і ўжо тады ён змяшчаў норму, згодна з якой Савет Міністраў павінен быў вызначыць парадак рэгістрацыі інтэрнэт-СМІ. Прапаноў пра тое, як рэгуляваць распаўсюджанне масавай інфармацыі праз інтэрнэт, было шмат, паведаміла міністр, пакуль, нарэшце, не саспела прапанаваная ў новым законапраекце форма.

Міністэрства інфармацыі і сёння атрымлівае шматлікія звароты грамадзян, арганізацый, органаў дзяржаўнага ўпраўлення пра непраўдзівую інфармацыю і абразы ў інтэрнэце, але вымушана адказваць, што пакуль інтэрнэт не з'яўляецца сродкам масавай інфармацыі, міністэрства не можа на яго ўплываць. З прыняццем новага закона сітуацыя зменіцца. Уступленне яго ў сілу чакаецца 1 студзеня 2015 года.

Таксама Лілія Ананіч адзначыла, што прыняцце гэтага праекта дакумента актуальнае ў сувязі з неабходнасцю гарманізацыі заканадаўства Беларусі з заканадаўствамі краін — партнёраў па ЕАЭС. У прыватнасці, законапраект прадугледжвае забарону на ўскладанне функцый рэдакцыі СМІ на юрыдычную асобу, акцыі якой або доля ў статутным фондзе 20 працэнтаў і больш належыць замежным дзяржавам, замежным і міжнародным юрыдычным асобам, замежнаму грамадзяніну, асобе без грамадзянства. Гэтая навела, на думку кіраўніка Мінінфарма, дасць магчымасць эфектыўна абараніць краіну ад дэструктыўнага знешняга ўплыву.

Таксама Мінінфарм уводзіць дзяржрэестры распаўсюджвальнікаў прадукцыі друкаваных, радыёвяшчальных і тэлевізійных СМІ. «Гэты механізм уводзіцца ўпершыню і дасць магчымасць забяспечыць дзяржаўныя прыярытэты ў развіцці нацыянальнай прасторы ў пытаннях распаўсюджвання СМІ», — сказала Лілія Ананіч. У прыватнасці, дзейнасць распаўсюджвальнікаў друкаваных масмедыя не адрэгулявана, дадала яна.

Акрамя таго, Лілія Ананіч адзначыла, што ў папраўках у новай рэдакцыі выкладзены артыкул, у якім гаворыцца пра інфармацыю, забароненую да распаўсюджвання СМІ. Забараняецца распаўсюджваць інфармацыю, накіраваную на прапаганду вайны, экстрэмісцкай дзейнасці, што змяшчае заклікі да такой дзейнасці. Тое ж самае датычыцца парнаграфіі, гвалту, жорсткасці і іншай інфармацыі, распаўсюджванне якой можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Калі на працягу года распаўсюджвальніку СМІ вынесена два або больш пісьмовых папярэджанняў наконт распаўсюджвання забароненых заканадаўствам матэрыялаў, то такі распаўсюджвальнік можа быць выключаны з дзяржрэестра. «Дзейнасць распаўсюджвальнікаў без уключэння ў дзяржрэестр не дапускаецца», — растлумачыла Лілія Ананіч. Пры гэтым плануецца, што інфармацыя аб тым, хто ўнесены ў рэестр, будзе размяшчацца ў адкрытым доступе на сайце Міністэрства інфармацыі.

Міністр інфармацыі звярнула ўвагу на тое, што пры распрацоўцы законапраекта выкарыстаны міжнародны вопыт рэгулявання медыясферы. «Дзяржава выбудоўвае адэкватную сусветнай практыцы інфармацыйную палітыку», — так ахарактарызавала яна дакумент.

Акрамя таго, учора ў Палацы прадстаўнікоў быў прыняты бюджэтны пакет законапраектаў у другім чытанні, папраўкі ў Крымінальны кодэкс, змены ў Закон аб асноўных кірунках унутранай і знешняй палітыкі Беларусі, праект закона «Аб рынку каштоўных папер» і шэраг іншых законапраектаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Рэгіён

# Чаму пустуе дом?

**На Гродзеншчыне сёння пустуе 67 дамоў, пабудаваных з падтрымкай дзяржавы, з выкарыстаннем ільготных крэдытаў. Вырашана разабрацца з сітуацыяй па кожным будынку і прыняць захады, каб усе яны ў першым квартале наступнага года былі заселены.**


Фота БЕЛТА.

Аб гэтым **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі ў Шчучыне. Ён таксама зазначыў, што сёлетняе заданне па будаўніцтве жылля (160 тысяч квадратных метраў) у вобласці будзе выканана. Дарэчы, усё жыллё цяпер будуецца толькі на ўмовах дзяржаўнага заказу.

Яшчэ адна прыярытэтная задача — пераадолець спад вытворчасці свініны з-за хваробы жывёлы і ў наступным годзе выйсці на ўзровень 2012-га. Гэта складана, але рэальна, лічыць Уладзімір Краўцоў, і будзе рабіцца па шэрагу кірункаў абласной праграмы. Гэта і запаўненне жывёлай пустуючых памяшканняў, і пашырэнне дзейных комплексаў, і будаўніцтва новых. Напрыклад, у Карэліцкім раёне будуецца сучасны рэпрадуктар на 27 тысяч парсючкоў.

Даходная частка абласнога бюджэту на гэты год планавалася ў памеры 13 трыльёнаў рублёў — перавыкананне складае каля 1 трыльёна руб. Гэтыя сродкі накіраваны на павелічэнне зарплаты работнікам сацыяльнай сферы (урачам, педагогам), а таксама на шэраг сацыяльных аб'ектаў. У прыватнасці, уведзены ў эксплуатацыю хірургічны комплекс дзіцячай абласной бальніцы, завершана рэканструкцыя абласной інфекцыйнай бальніцы, пабудаваны медустановы ў Гродзенскім, Лідскім, Мастоўскім і Воранаўскім раёнах, некалькі школ і дзіцячых садкоў.

Эканоміка рэгіёна выконвае практычна ўсе прагнозныя паказчыкі, але апошнім часам дынаміка замарудзілася, зазначыў старшыня аблвыканкама. Гэта звязана найперш з дэвальвацыяй расійскага рубля, бо менавіта на Расійскую Федэрацыю разлічана 60% экспарту Гродзеншчыны. А па мяса-малочнай прадукцыі — 96%. Зразумела, усе экспарцёры нясуць страты, некаторыя прадпрыемствы былі нават вымушаны прыпыніць пастаўкі тавару ў Расію.

Больш упэўнена ў гэтай сітуацыі адчуваюць сябе прадпрыемствы з шырокай, арыентаванай не толькі на Расію, геаграфіяй экспарту. А таксама тыя, хто, пастаўляючы гатовую прадукцыю на расійскі рынак, адтуль жа атрымлівае сыравіну. Прыклад — Шчучынскі завод «Аўтапровад» (сёлета найбуйнейшы перапрацоўшчык медзі ў Беларусі), дзе пабывалі журналісты перад прэс-канферэнцыяй. Прадпрыемства добра мадэрнізавана.

— Калі сітуацыя з расійскім рублём будзе пагаршацца, то цуду і ў нас, напэўна, не адбудзецца. Пакуль жа ходзь і цяжка, але «змагаемся». Працуем па пяцідзённы, за выключэннем цэха аўтатрактарных камплектаў — ён працуе чатыры дні, паколькі на снежань і наступны месяц няма заказаў ад МАЗа. Каб неяк кампенсаваць гэтыя страты, правялі перамовы і ўжо зрабілі пробныя жгуты для расійскіх снегаходаў. Штомесяц адпраўляем дзве фуры са сваім таварам у Казахстан, крыху — у Чэхію. Выпраўляем і эксклюзіўную прадукцыю, — кажа **дырэктар завода «Аўтапровад» Генадзь СКІТАЎ.** — Цяпер, напрыклад, выконваем заказ з Чачэнскай Рэспублікі на выраб кабелю для фантанаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

■ Падрыхтоўка да свят

## УНІВЕРСАЛЬНЫ ПАДАРУНАК АД БЕЛАРУСБАНКА

Напярэдадні калядных і навагодніх свят, як звычайна, становяцца актуальнымі «адвечныя» пытанні: чым парадаваць сваіх сяброў, родных і блізкіх, які падарунак ім зрабіць? На шчасце, недахопу ў выбары няма: на рынку пастаянна з'яўляюцца новыя цікавыя прапановы, пачынаючы ад дзіцячых цацак і заканчваючы рознымі гаджэтамі. Аднак багацце выбару, на жаль, не гарантуе, што ваш гасцінец стане і сапраўды жаданым.

Цяпер у Беларусбанка ёсць спецыяльная прапанова, якую можна смела назваць універсальным прэзентам — **падарункавая картка Maestro.** Асаблівасцю гэтых картак з'яўляецца тое, што для іх афармлення не патрабуецца прад'яўлення дакумента, які сведчыць асобу, і яны могуць быць перададзены іншай асобе ў якасці падарунка. Такая картка мае спецыяльны дызайн, яна запакоўваецца ў прыгожы канверт і дазваляе здзяйсняць шырокі спектр безнаяўных плацяжоў, здымаць наяўныя грашовыя сродкі і папаўняць рахунак.

**Сяргей ПАЛІНІН**

■

■ Будзь у курсе

## 1 СТУДЗЕНЯ — ПА ГРАФІКУ ВЫХАДНОГА

У сувязі з пераносам рабочых дзён ў снежні і студзені «Мінсктранс» паведаміла, што аўтобусныя маршруты 25—26, 28 снежня, 1-4, 7 і 11 студзеня будуць курсіраваць па графіку нядзелі, а 27 снежня — як па суботах. Тралейбусы 25—27 снежня будуць працаваць па раскладзе суботы; 28 снежня, 1—4, 7 і 11 студзеня — па графіку нядзельных дзён. Трамваі 25—28 студзеня, 1-4, 7 і 11 студзеня будуць курсіраваць, як па выходных.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

**Работнікі сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне саветніку-кансультанту аддзела грамадзянскага і сацыяльнага права Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Рама725ўскай Ганне Юр'еўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

■ Падрабязнасці

# КАПІТАЛ ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ

## КАЛІ НА ПРАЦЯГУ ТРОХ ГАДОЎ ПАСЛЯ 18-ГОДДЗЯ ДЗІЦЯЦІ БАЦЬКІ НЕ ЗВЕРНУЦЦА Ў ВЫКАНКАМ, ГРОШЫ ПОЙДУЦЬ У БЮДЖЭТ

**Размовы наконт сямейнага капіталу пачаліся ўжо даўно. Вывучэнне мэтазгоднасці такога заходу было прадугледжана ў Нацыянальнай праграме дэмаграфічнай бяспекі, якая цяпер рэалізуецца.**

Адна з прычын — зніжэнне колькасці жанчын дзетароднага ўзросту (па прагнозах, у наступныя пяць гадоў іх стане менш на 163 тысячы), якое адпаведна можа выклікаць спад нараджальнасці. Да таго ж, згодна з перапісам насельніцтва 2009 года, больш за палову беларускіх сем'яў застаюцца аднадзетнымі. Шматдзетных толькі шэсць працэнтаў. Гэта значыць, што ў наступным пакаленні колькасць сем'яў можа скараціцца на трэць. Таму існавала неабходнасць у дадатковых заходах, якія б спрыялі павышэнню нараджальнасці і росту дабрабыту сем'яў з дзецьмі. І адпаведны Указ кіраўніка дзяржавы аб сямейным капітале стаў лагічным працягам планамернай работы.

— Мы пайшлі ўслед расійскаму вопыту, дзе ўвядзенне мацярынскага капіталу дазволіла за восем гадоў узняць сумарны каэфіцыент нараджальнасці з 1,3 да 1,7, — каментуе **кансультант аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЯЛАШ.** — Аднак адрозненні ёсць. У Расіі карыстацца грашыма можна па заканчэнні трох гадоў з дня нараджэння другога ці наступнага дзяцей. У нас сямейны капітал з'яўляецца мерай доўгатэрміновай падтрымкі. Гэта абумоўлена тым, што сістэма заходаў, якая цяпер існуе, забяспечвае ўсеагульны ахоп ільготамі і гарантыямі. А вось пасля паўналецця дзіцяці сродкі сямейнага капіталу якраз і будуць матэрыяльнай падтрымкай сям'і.

### ДАВЕДКА

***Беларуская сістэма мер эканамічнай падтрымкі сем'яў, што выхоўваюць дзяцей, дазволіла дасягнуць самых высокіх паказчыкаў нараджальнасці за апошнія дваццаць гадоў. Калі ў 1995 годзе на свет з'явілася 101 тысяча дзяцей, то ў 2013 — на 17 тысяч больш. Сумарны каэфіцыент нараджальнасці вырас да 1,67. Аднак гэтага недастаткова: для простага ўзнаўлення насельніцтва неабходны каэфіцыент 2,15.***

10 тысяч долараў бацькі атрымаюць пасля нараджэння трэцяга ці наступнага дзіцяці. Сума і працэнты, што «набягуць» за 18 гадоў, будуць ляжаць на спецыяльным рахунку, які трэба адкрыць у Беларусбанку. Капітал не абкладаецца падаходным падаткам. Новай формай дапамогі можна скарыстацца толькі адзін раз і накіраваць грошы на паляпшэнне жыллёвых умоў, атрыманне адукацыі, медыцынскіх ці сацыяльных паслуг. Выкарыстаць сродкі раней дазваляецца толькі пры тэрміновай неабходнасці платнага лячэння. Калі на працягу трох гадоў пасля 18-годдзя дзіцяці бацькі не звернуцца ў выканкам, грошы пойдуць у бюджэт.

Прыярытэт, як і ў сістэме дзяржаўнай дапамогі, аддаецца маці, але калі жанчына не мае на гэта права (напрыклад, не з'яўляецца грамадзянкай Рэспублікі Беларусь), то капітал прызначаць бацьку. Як расходаваць грошы, вырашаюць усе паўналетнія члены сям'і. Калі паміж імі не будзе дасягнута згоды, сродкі размяркуюць пароўну на кожнага чалавека.



Па падліках міністэрства, у наступным годзе права на сямейны капітал атрымаюць прыкладна 16 тысяч сем'яў.

— Мера разлічана на пяць гадоў (з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года). Ці будзе яна потым падоўжана, пакуль казаць рана. Гэта залежыць ад эфектыўнасці нормы, фінансавых магчымасцяў дзяржавы, — кажа Святлана Мікалаеўна.

Дарэчы, расійскі мацярынскі капітал налічваецца ў рублях. Нават з улікам штогадовай індэксацыі, сума ў доларавым эквіваленце паменшылася. Калі напачатку яна складала амаль дзевяць з паловай тысяч долараў, то цяпер — менш за восем тысяч. Нядаўна, праўда, Міністэрства эканамічнага развіцця Расіі прапанавала адмовіцца ад мацярынскага капіталу і сэканоміць 300 мільярдаў рублёў за год. На думку міністэрства, капітал не павялічвае колькасць дзяцей, а толькі зрушвае каляндар нараджэнняў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■ Энергетыка

# НАЛЕТА НАСЕЛЬНІЦТВА СТАНЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ У ПОЎНЫМ АБ'ЁМЕ?

## А БЛАКІТНАЕ ПАЛІВА ДЛЯ КРАІНЫ СТАНЕ КРЫХУ ТАННЕЙ

**Спецыялісты падлічылі, што па выніках гэтага года жыхары нашай краіны будуць пакрываць больш за 80% выдаткаў на электрычную энергію. Аб гэтым учора паведаміў <u>намеснік міністра энергетыкі Беларусі Вадзім ЗАКРЭЎСКІ.</u>**

Закранаючы тэму змянення тарыфаў на электрычнасць, намеснік міністра не выключыў, што ў наступным годзе насельніцтва будзе плаціць па іх больш і пачне цалкам кампенсаваць выдаткі на электраэнергію. Такая верагоднасць сапраўды ёсць, лічыць кіраўніцтва «Белэнерга». У гэтым выпадку сітуацыя з тарыфамі будзе залежыць ад таго, як Мінэканомікі ў якасці рэгулятара ў гэтай галіне будзе планаваць індэксы росту тарыфаў на паслугі ЖКГ, зыходзячы з росту рэальнай зарплаты. «Наколькі дазволяць адпаведныя тэмпы росту зарплаты, такія рашэнні і будуць прыняты», — удакладніў пазіцыю міністэрства Вадзім Закрэўскі.

У прыватнасці, ён нагадаў, што ў краіне вызначаны



крытэрыі росту тарыфаў на паслугі ЖКГ, якія складаюць не больш за 5 долараў на год плюс індэксацыя ў залежнасці ад індэкса змянення цэн. Для цеплавой энергіі ўзровень выдаткаў, што кампенсуюцца насельніцтвам, на канец года складзе 23%. Прадугледжана, што ў 2017 годзе гэты паказчык плануецца давесці да 40%.

Вадзім Закрэўскі асобна паведаміў, што кантракт на пастаўку расійскага газу ў Беларусь можа быць падпісаны ў бліжэйшы час. Паколькі курс расійскага рубля зніжаецца, то з першых дзён студзеня цана на газ для нашай краіны павінна крыху знізіцца. Нагадаем, што сёння мы плацім каля 168 долараў за 1 тысячу кубічных метраў прыроднага газу. Плануецца, што цэннік на гэтае паліва налета будзе каля 154–155 долараў. Адказваючы на пытанне аб прагнозах зніжэння цэн на газ для рэальнага сектара эканомікі, Вадзім Закрэўскі праінфармаваў, што іх плануюць захаваць на існуючым узроўні. Тут спецыяліст нагадаў, што цэментныя заводы і прадпрыемствы шкляной прамысловасці маюць прэферэнцыі на тарыфы і па электраэнергіі, і па газе. Падобная льготная тарыфная палітыка павінна захавацца па адзначаных кірунках і налета, лічыць намеснік міністра.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Факт

# НІ КРОКУ НАЗАД

**Стаўка рэфінансавання Нацыянальнага банка ў снежні захаваецца на ўзроўні 20% гадавых.**

«На фоне далейшага запавольвання інфляцыйных працэсаў (у лістападзе індэкс спажывецкіх цэн у гадавым выражэнні склаў 118,3% у параўнанні са 119,4% у кастрычніку) захаванне бягучага ўзроўню стаўкі рэфінансавання будзе садзейнічаць зніжэнню тэмпаў росту спажывецкіх коштаў, падтрыманню ўстойлівага стану валютнага і дэпазітнага рынкаў, забяспечваючы прывабныя ўмовы для збераджэнняў у беларускіх рублях», — паведамляюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

# ІНФЛЯЦЫЯ ЗА 11 МЕСЯЦАЎ — 15,5%

## МЕДЫКАМЕНТЫ ЗА ГЭТЫ ЧАС ПАДАРАЖЭЛІ НА 24,1%

**Індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам склаў 100,6%, са снежнем 2013 года — 115,5%. Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, схільныя да ўплыву фактараў адміністрацыйнага і сезоннага характару, — 100,6% і 114,1% адпаведна.**

На звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у мінулым месяцы ў параўнанні з кастрычнікам больш за ўсё падаражэлі бульба, а таксама крупы і бабовыя — рост коштаў на гэтыя прадукты склаў 4,7% і 3%. На 2,3% вырасла цана на гародніну, на 2% падаражэлі кандытарскія вырабы, на 1,9% — рыбныя кансервы. На астатніх пазіцыях рост склаў менш за 1%. Пры гэтым садавіна патаннела ў лістападзе на 1,9%, рыба і харчовыя морапрадукты — на 0,8%, мяса і птушка — на 0,4%, макаронныя вырабы — на 0,3%. У цэлым жа харчовыя тавары ў мінулым месяцы падаражэлі на 0,4%, у параўнанні са снежнем 2013 года — на 18,2%.

Цэны на нехарчовыя тавары ў лістападзе ў параўнанні з кастрычнікам выраслі на 0,3%, са снежнем мінулага года — на 7,5%. Больш за ўсё падаражэлі медыкаменты — на 2,4% у параўнанні з кастрычнікам (на 24,1% у параўнанні са снежнем 2013-га). Патаннелі ў лістападзе абутак і пісьмовыя прылады — на 0,1%.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■ Ну і ну!

# Браканьерамі аказаліся тыя, хто павінен ім супрацьстаяць

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі затрымалі групу паляўнічых, якая складалася з больш чым дзясятка чалавек, сярод якіх былі службовыя асобы шэрагу структур. У тым ліку — два супрацоўнікі... Гомельскай абласной і міжраённай інспекцый аховы жывёльнага і расліннага свету.**

Гэтая група падчас правядзення палявання па рэгуляванні колькасці дзіка ў рамках барацьбы з АЧС здабыла не менш за тры ласі. Адбылося гэта на тэрыторыі з радыяцыйным забруджваннем.

— Шкода складае 135 мільёнаў рублёў за кожную асобіну. За здзейсненае правапарушэнне ўдзельнікам незаконнага палявання пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі з забаронай займацца пэўнай пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга ГРАМОВІЧ.** — Раней кіраўніцтвам Дзяржінспекцыі адзначаліся недахопы ў кіраўнічай дзейнасці Гомельскай абласной інспекцыі. За ўпушчэнні ў рабоце ў кастрычніку па выніках праведзенай праверкі начальнік абласной інспекцыі быў адхілены ад пасады і пазней звольнены. Для нармалізацыі становішча ў Гомельскую абласную інспекцыю ў пачатку снежня быў прызначаны новы кіраўнік.

Днямі калегія Дзяржінспекцыі прыняла рашэнне аб звальненні намесніка начальніка Гомельскай абласной інспекцыі, паніжэнні ў пасадзе начальніка Гомельскай міжраённай інспекцыі, а таксама прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці начальніка Кармянскай міжраённай інспекцыі, на тэрыторыі якой было здзейснена правапарушэнне, і начальніка аператыўна-аналітычнага аддзела Гомельскай абласной інспекцыі. Супрацоўнікі, якія знаходзяцца пад следствам, будуць звольнены з захаваннем вызначаных працэдур у рамках крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАЗУ ЗА ЗАЙЦА

## Спрабаваў выдаць браканьер інспектарам

Жыхар Пастаўскага раёна знаходзіўся ў паляўнічых угоддзях ААТ «Возера» цалкам законна: і стрэльба зарэгістраваная, і дазвол на здабычу пушнога звера аформлены, як трэба. Аднак яго дзеянні нездарма прыцягнулі ўвагу супрацоўнікаў Глыбоцкай міжрайінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету, якія знаходзіліся ў рэйдзе.

Як расказаў рэдакцыі начальнік міжрайінспекцыі Аляксей Протас, правапарушэнне адбылося на вачах інспектараў. Адна з дзвюх казуль, якія прабягалі побач, пасля некалькіх стрэлаў раптоўна рухнула. З лесу выйшаў паляўнічы, схапіў жывёліну за нагу і паспрабаваў адцягнуць. З'яўленне інспектараў стала для яго сапраўднай нечаканасцю. Прычым небарака ўсхваляваўся настолькі, што ў сваё апраўданне не змог прыдумаць нічога лепшага, як заявіць, што страляў па... зайцы!

**Ул. інф.**

# ЗАКРЫЦЦЁ — НЕ САМАМЭТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мэта ўказа — прымусіць нядобрасумленных суб'ектаў гаспадарчай дзейнасці паводзіць сябе ў рамках дзейнага заканадаўства,— тлумачыць **намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Ігар ГАЕЎСКІ.**— Бо ў нас ёсць тыя, хто спрабуе атрымаць звышпрыбытак. Закрыццё аб'екта — вядома ж, не самамэта, паколькі ў выніку пацерпяць людзі. І тыя, хто там працаваў і застаўся на нейкі час без заробку, і тыя, хто раней набываў тут тавар.

Прадастаўленне Міністэрству гандлю права прыпыняць работу гандлёвых аб'ектаў і аб'ектаў грамадскага харчавання дазваляе аператыўна выпраўляць парушэнні ў сферы ажыццяўлення гандлю і цэнаўтварэнні, уплываць на выкананне пагадненняў, якія падпісваюцца паміж вытворцамі і гандлёвымі аб'ектамі, забяспечваць насычэнне ўнутранага рынку пераважна таварамі айчыннай вытворчасці, не ўшчамляючы пры гэтым інтарэсы імпарцёраў і замежных вытворцаў. Міністэрствы гандлю, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, Дзяржстандарт падпісалі сумесны загад аб узаемадзеянні па выкананні нормаў і патрабаванняў указа.

— Нашым міністэрствам ужо вынесены рашэнні па 10 гандлёвых аб'ектах па краіне,— адзначае **першы намеснік міністра гандлю Беларусі Артур КАРПОВІЧ.**— Гэта былі выпадкі рэалізацыі пратэрмінаваных тавараў, парушэнняў асартыментнага пераліку і рэжыму працы, абважвання, падману спажыўцоў.



Існуе каля пятнаццаці крытэрыяў, на падставе якіх прымаюцца рашэнні аб прыпыненні дзейнасці аб'екта гандлю. Адна справа, калі ў парушальніка адсутнічае пара цэннікаў — за гэта яго дзейнасць не спыняць. А калі размова ідзе аб пратэрмінаваных таварах на мільённы рублёў? Ці вось узяць парушэнне ў частцы адсутнасці асартыментнага пераліку айчынных тавараў. Каб выправіць гэтае парушэнне, гандлёвы аб'ект павінен мець час на закупку, прывоз, размяшчэнне тавару. Работа прадпрыемства ў гэтым выпадку прыпыняецца для правядзення ўсёй гэтай работы.

Так, у адным з магазінаў сеткі «Пяты элемент» па асартыментным пераліку павінна быць дзесяць айчынных пральных машын, а фактычна былі чатыры. Па тэлевізарах: павінна быць 10, у наяўнасці — 9; халадзільнікі/маразільнікі: павінна быць 20, у наяўнасці — 12. «Пры гэтым імпартных тавараў — вельмі шырокі асартымент,— кажа Артур Карповіч.— Хіба мы павінны папярэджваць: «Павярніцеся тварам да айчыннага спажыўца?». Вось як толькі прыпынілі работу гандлёвага аб'екта, дык адразу пачаўся актыўны закуп гэтай прадукцыі».

З пункту гледжання аховы здароўя ў рэалізацыі не павінна быць небяспечных для здароўя тавараў. Першы раз, напрыклад, пратэрмінаваны прадукт могуць зняць з рэалізацыі, прыцягнуць да адміністратыўнай адказнасці службовых і юрыдычных асоб, прапанаваць перагледзець эфектыўнасць унутранага вытворчага кантролю. Калі суб'ект сумленны, то гэтым карныя меры і абмяжуюцца. Аднак калі праз нейкі час зноў будуць зафіксаваны былыя парушэнні, аб'ект закрыюць спачатку тэрмінам да 30 сутак. Пры чарговым парушэнні — да 60-ці. Урэшце — пры чацвёртым «эпізодзе» — да 90 сутак. З моманту ўступлення ўказа ў сілу Міністэрства аховы здароўя прыпыніла дзейнасць 76 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. У некаторых выпадках міністэрствы гандлю і аховы здароўя будуць прымаць асобныя рашэнні, у іншых — сумесныя.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

**Намеснік міністра аховы здароўя — галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Ігар ГАЕЎСКІ**

***Пра лекі:***

— Я сам з'яўляюся спажыўцом беларускіх медыцынскіх прэпаратаў. Як галоўны дзяржаўны санітарны ўрач магу сказаць пра тыя ж вакцыны: кожная партыя падвяргаецца адпаведнаму кантролю, дадатковым выпрабаванням, пасля якіх і дапускаецца да выкарыстання. Тое ж можна сказаць і пра ўсе астатнія лекі: кожная партыя прэпарата, які не прайшоў выпрабаванняў, на рынак не паступае. Падробак у беларускіх аптэках не бывае — у нас дзейнічае эфектыўная сістэма кантролю за паступленнем гэтых тавараў на наш рынак.

■ Безнаяўны разлік

## РЭКЛАМУЮЦЬ УСЕ!

**Нацыянальны банк Беларусі рэкамендаваў камерцыйным банкам больш актыўна рэкламаваць сярод кліентаў зберагальныя пластыкавыя карткі.**

Такім чынам, галоўны фінансавы рэгулятар краіны патрабуе ад камбанкаў актывізаваць эмісію зберагальных картак як па заробкавых праектах, так і пры індывідуальным заключэнні дагавораў з кліентамі. Цяпер і прыватным структурам для гэтага рэкамендавана арганізаваць рэкламныя, інфармацыйныя і іншыя мерапрыемствы. У Нацбанку ўпэўнены, што гэта паслужыць стымулам для росту ліку безнаяўных плацяжоў, павысіць зацікаўленасць кліентаў у захоўванні грошай на бягучых (разліковых) рахунках і рахунках па ўліку укладаў (дэпазітаў) у беларускіх рублях, да якіх выдадзены карткі.

На 1 кастрычніка зберагальныя карткі прапаноўвалі 19 банкаў-эмітэнтаў. Выпушчана 3,1 млн зберагальных картак, што складае 25% ад банкаўскіх плацежных картак, якія знаходзяцца ў абароце. Пры гэтым 75% з іх эмітаваны па заробкавых праектах.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Сталічны час

# ВІДЭАНАЗІРАННЕ, КАНДЫЦЫЯНЕРЫ І АСОБНЫЯ ПАЛОСЫ ДЛЯ РУХУ

## ЯКІЯ ЗМЕНЫ ЧАКАЮЦЬ ТРАНСПАРТНУЮ СФЕРУ МІНСКА

**Пасля чарговага падаражання праезду ў грамадскім транспарце спецыялісты заявілі: мінчане аплачваюць хіба што палову яго сабекошту. Каб цалкам пакрыць выдаткі, квіток на праезд павінен каштаваць восем тысяч рублёў. Зрэшты, транспартнікі тут жа зрабілі папраўку: нідзе ў свеце за транспарт не плацяць поўны кошт. Якія яшчэ вынікі за год падвялі прадстаўнікі мінскіх транспартных прадпрыемстваў і што запланавалі на 2015-ы?**

### «Зайцоў» стала менш

Вось неўзабаве міне год, як была ўведзена сістэма аўтаматызаванай аплаты за праезд. Па словах **намесніка КУП «Мінсктранс» Андрэя ПАПЛЁЎКІ,** дзякуючы ёй удалося павысіць матывацыю аплаты праезду, эфектыўнасць яе кантролю, зніжэння выдаткаў за кошт скарачэння штату кандуктараў і друку папяровай прадукцыі.

Увядзенне дыферэнцаванай аплаты за праезд у сталіцы дапамагло вырашыць яшчэ адну праблему: колькасць безбілетнікаў у транспарце зменшылася. Па словах Андрэя Паплёўкі, цяпер на гарадскіх маршрутах за месяц афармляецца каля 14–15 тысяч штрафаў, якія выпісваюць каля 200 кантралёраў, што працуюць у Мінску.

Гаворачы пра планы на наступны год, Андрэй Паплёўка паведаміў, што будзе павялічана колькасць пунктаў папаўнення бесконтактных смарт-картаў. У прыватнасці, свае праязныя цяпер можна будзе папоўніць на банкаўскіх тэрміналах самаабслугоўвання.

### Рухомы састаў папоўніцца навінкамі

У 2015 годзе плануецца набыць 215 аўтобусаў, 60 тралейбусаў, а з мэтай скарачэння інтэрвалу руху метро да 1 хвіліны 45 секундаў — пяць саставаў (25 вагонаў), паведаміў **намеснік дырэктара ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Андрэй ІЛАРЫЁНАЎ.** Апроч таго, каля 15% аўтобусаў і 50% тралейбусаў, што набываюцца, павінны быць абсталяваны сістэмамі кандыцыянавання паветра, відэаназірання салона, рампамі для інвалідных калясак, а ў тралейбусах плануецца ўкараненне аўтаномнага ходу.

У сваю чаргу **першы намеснік генеральнага дырэктара «Мінсктранса» Мікалай ГАПАНОВІЧ** заявіў, што ў якасці доследнай эксплуатацыі налета ў сталіцы набудуць 10 аўтобусаў, якія будуць працаваць на газаматорным паліве. Спецыялісты лічаць гэты напрамак перспектыўным, бо такія аўтобусы больш экалагічныя, ды і кошт паліва для іх удвая ніжэйшы за дызельныя.

Цяпер вытворчая база «Мінсктранса» складаецца з 1,8 тыс. аўтобусаў, 1 тыс. тралейбусаў, 159 трамваяў і 361 вагона метро, а таксама 600 маршрутных таксі. Сярэдні ўзрост сталічных аўтобусаў складае 5,7 года, тралейбусаў — 6,2, трамваяў — 7,5. У 2014 годзе ў горадзе набылі 191 аўтобус, 50 тралейбусаў і пяць саставаў метро.



Фота Надзеі БУЖАН.

### З'явяцца асобныя палосы для грамадскага транспарту

**Намеснік генеральнага дырэктара «Мінсктранса» Віктар ТОЗІК** адзначыў, што ў сталіцы існуюць дзве асноўныя праблемы па абслугоўванні пасажыраў, і абедзве яны звязаны з высокай аўтамабілізацыяй насельніцтва. Першая датычыцца графіка руху гарадскога транспарту: часам аўтобусы не ўкладваюцца ў іх, бо мусяць прастойваць у заторах. Каб вырашыць гэтае пытанне, на дарогах вылучаць асобныя палосы для руху грамадскага транспарту, а GPS-сістэма, што выкарыстоўваецца для адсочвання транспартных маршрутаў, будзе звязана са святлафорамі.

Намеснік гендырэктара дадаў, што ў горадзе да чэмпіянату свету па хакеі на прыпынках усталявалі 20 электронных табло, якія зарэкамендавалі сябе найлепшым чынам. Таму ў першым квартале 2015-га на прыпынках уздоўж праспекта Незалежнасці з'явяцца яшчэ 20 такіх табло.

Другая праблема — недахоп паркавачных месцаў у горадзе. «Асобныя вуліцы ў Мінску, асабліва крайнія правыя палосы, ператвараюцца ў паркавачныя месцы. Ёсць асобныя вуліцы — Кісялёва, Сухараўская — дзе транспарт не можа раз'ехацца»,— выказаў абурэнне Віктар Тозік.

### Новага аўтавакзала не будзе

Замест аўтавакзала «Маскоўскі», які спыніў сваю работу 1 красавіка, новага аўтавакзала ў Мінску будаваць не будуць. «Наяўнасць трох аўтавакзалаў — недазвальняльная раскоша. Напрыклад, у Берліне, які па плошчы і колькасці насельніцтва большы за Мінск,— адзін міжнародны аўтавакзал»,— сказаў Віктар Тозік.

Разам з тым намеснік гендырэктара адзначыў, што можна разгледзець пытанне аб размяшчэнні невялікай аўтастанцыі ў мікараёне Уручча. Паводле яго слоў, гэта павінен быць кампактны будынак з мінімальнымі выгодамі для пасажыраў, а не манументальнае збудаванне, адно толькі абслугоўванне якога патрабуе немалых сродкаў.

### «Разумныя» прыпынкі — пад пытаннем

У Мінску разглядаецца магчымасць устаноўкі «разумных» прыпынкаў. Яны будуць укамплектаваны электроннымі прыладамі, якія дазволяць пасажыру арыентавацца ў рабоце пасажырскага транспарту. Мяркуецца, што на прыпынках размесціцца электроннае табло, на якім будзе адлюстроўвацца розная інфармацыя аб рэйсавым раскладзе транспарту, схемы і трасы кірунку маршрутаў. Аднак масавага распаўсюджвання такія прыпынкі не атрымаюць, сказаў Андрэй Іларыёнаў, бо гарадскі бюджэт не пацягне такіх выдаткаў. Рэалізацыя праекта стане магчымай, калі знойдуцца інвестары.

Затое ўжо дакладна вядома, што ў другім квартале 2015 года пачне дзейнічаць дыспетчарскі пункт па каардынацыі работы маршрутных таксі.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**изолированного помещения столовой,**

**инвентарный номер 710/D-68145, общей площадью 2205,2 кв.м, расположенного по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5, на земельном участке пл. 0,1650 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования.**

**Начальная цена с НДС – 6 080 892 000 белорусских рублей.**
**Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и вознаграждения за организацию аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **20.01.2015** в 14.00 по адресу: **г. Бобруйск, ул. Шинная, 5.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.01.2015** до 17.00 по адресу: г. Минск, **ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.**

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

18 СНЕЖНЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15759)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Рыгор ЛАВЫШ:

# «З ДУМКАЙ, ШТО ТЫ — БЕЗДАР, ТРЭБА ПЕРАСПАЦЬ...»



**Ёсць афарызм, што за кожным паспяховым мужчынам стаіць жанчына. Прыкладам таму можа быць гісторыя Рыгора Лавыша, удзельніка трэцяга сезона расійскага шоу «Голас». Яго жонка Анастасія адправіла ад імя мужа заяўку на кастынг — і гэта аказаўся шчаслівы білет на сцэну. На сляпых праслухоўваннях Рыгор пакарыў голасам траіх настаўнікаў і дайшоў да трэцяга тура шоу. У выніку хоць і пакінуў праект, але атрымаў стымул заняцца сольнай кар'ерай. Паралельна ён працуе салістам у Гродзенскім абласным эстрадна-сімфанічным аркестры, выступае з калектывам «Fat Band» і выхоўвае трохгадовага сына. Мы сустрэліся з маладым артыстам і пацікавіліся, якім было самае складанае выпрабаванне на шоу, ці ўдаецца яму адпачываць ад музыкі і хто яго найпершы крытык...**

***— Рыгор, выступленне на сляпых праслухоўваннях адбылося акурат на твой дзень нараджэння. Ці не ўспрыняў такое супадзенне як падарунак лёсу?***

— Насамрэч я выступаў 52-м са 150 чалавек. Суддзі праслухоўвалі кандыдатаў, якія хацелі трапіць на шоу, тры дні. Я быў на другі дзень другім. Мы ведалі толькі тое, што эфіры будуць з 5-га верасня, і, відаць, рэжысёры вырашылі зрабіць мне такі падарунак.

***— У момант, калі да цябе развярнуліся тры настаўнікі праекта, што адчуваў?***

— Я быў шакіраваны, бо не чакаў, што хоць нехта павернецца. Я вельмі самакрытычны і чуў за кулісамі шмат людзей з больш моцнымі галасамі, чым у мяне. Канкурэнцыя была такая, што словамі не перадаць! Таму паставіў сабе планку проста выступіць годна. Нам казалі так: з усіх прэтэндэнтаў па тэлевізару пакажуць толькі 56 чалавек. І арыентавалі нас на тое, каб было больш эмоцый падчас выступлення, бо тады цікава глядзець. Вось я і падумаў: трэба выступіць, каб хоць жонка ўбачыла маё выступленне. І потым, калі да мяне трое павярнуліся, то ўнутры была проста істэрыка.

***— Ты неяк зазначыў, што калі казаць пра закуліссе шоу, то там кожны змагаецца перш за ўсё з самім сабой...***

— Усё, што адбываецца, цяжка вытрымаць перш за ўсё маральна. На цябе ідзе пастаянны ціск з боку рэжысёра, музычных рэдактараў, твайго настаўніка. А яшчэ родныя і знаёмыя... Ты не маеш права падвесці наогул нікога. Баішся элементарна захварэць, калі надвор'е мяняецца. Паміж сабой у нас ніхто не змагаўся, а, наадварот, мы старaліся адзін аднаго падтрымліваць, бо разумелі, што ад нас ужо нічога не залежыць.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Юніёры

# «Набіць мячыкам» чэмпіёнства

**У дзяцінстве гераіня гэтага матэрыялу круціла на лёдзе піруэты і марыла стаць фігурысткай. Але лёс распарадзіўся інакш — і канькі ўступілі месца тэніснай ракетцы. Цяпер Вера вельмі рэдка надзявае канькі, і тое толькі ролікі. Затое ў тэнісе шаснаццацігадовая дзяўчына ўжо дабілася пэўных поспехаў. Сёлета, напрыклад, выйшла ў парны фінал юніёрскага US Open. Чаму выпадковы тандэм аказаўся ўдалым, якое месца ў Нью-Ёрку самае прыгожае і як «блаславіць» спартсмена на чэмпіёнства, «Чырвонцы» распавяла адна з лепшых юніёрак краіны, <u>тэнісістка Вера ЛАПКО.</u>**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Акрамя US Open, які старт гэтага года ўспамінаецца часцей за ўсё?***

— Камандны чэмпіянат свету, які праходзіў у Мексіцы. На ім мы занялі шостае месца, але, калі б не мае праблемы са здароўем, упэўнена, гэты вынік быў бы вышэйшым. Справа ў тым, што ў Лацінскай Амерыцы вада не лепшай якасці, там прысутнічаюць нейкія бактэрыі, якіх няма ў нас. І ежа ў Мексіцы спецыфічная... Хаця я старалася не піць звычайную ваду і ела толькі знаёмыя стравы, пазбегнуць атручэння не атрымалася. Прапусціла вырашальныя паядынкі, было вельмі крыўдна. Адчувала, што як першы нумар зборнай нічым не дапамагаю дзяўчатам.

***— Ты ўпершыню была лідарам зборнай?***

— Не зусім. Летась у беларускім рэйтынгу тэнісістак да 18 гадоў я была другой, але на нейкіх спаборніцтвах, дзе ўлічваўся еўрапейскі рэйтынг, выходзіла першым нумарам каманды. Неяк Іра Шымановіч (двухразовы прызёр другіх юнацкіх Алімпійскіх гульняў — **Аўт.**), калі мы разам выступалі за каманду, дзялілася са мной вопытам. Так што да цяжару лідарства я была падрыхтавана і ведала, як паводзіць сябе ў падобных сітуацыях.

***— Дарэчы, тое, што на US Open пабач была старэйшая сяброўка, дапамагала табе?***

— Безумоўна! Я была вельмі рада, што мы з Ірай абедзве аказаліся ў асноўнай сетцы. Падчас спаборніцтваў жылі ў адным нумары, па вечарах, напярэдадні сваіх матчаў, вельмі шмат размаўлялі. Іра падтрымлівала мяне, бо я, напэўна, ніколі раней не адчувала такога хвалявання. Да таго ж настрой у мяне быў не самы лепшы. На падрыхтоўчых турнірах правалілася — не прайшла ніводнага раўнда. А ў Нью-Ёрку і кваліфікацыю «адзіночкі» пераадолела, і некалькі кругоў прайшла, і ў фінал «пары» трапіла.

*(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)*

разМЕРКАВАННЕ

# АД МУЗЫКІ ДА МАГІІ — АДЗІН КРОК,

## або Як баяніст у... фокуснікі падаўся

**Так павялося, што, выбіраючы месца для размеркавання, моладзь спыняецца на адным з двух варыянтаў — альбо бліжэй да сталіцы, альбо да роднага горада. А сям'я музыкантаў Паўла і Кацярыны ЛАВЕЦ, скончыўшы навучанне, найперш шукала месца для стварэння ўтульнага сямейнага гняздзечка — і ім пашанцавала ў Мазыры. Больш за год маладыя жывуць і працуюць на новым месцы, і за гэты час самым галоўным дасягненнем пары стаў сумесны «праект» — дачка Маша. З Паўлам Іграшвічам, выкладчыкам Мазырскага дзяржаўнага музычнага каледжа, мы пагутарылі і даведаліся, як жывецца маладым спецыялістам у палескім горадзе.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### «ВЫПАДКОВА» ВЫБРАЦЬ СУЖЭНЦА

Павел паходзіць з Мёраў, слаўных беларускіх мясцін, вядомых сваімі азёрамі. Яго жонка Кацярына нарадзілася і вырасла на радзіме Рыгора Барадуліна, у гарадскім пасёлку Вушачы. Хлопец пайшоў па шляху свайго бацькі. Той скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі па спецыяльнасці «Баян-акардэон», а пасля застаўся працаваць у Мёрскай музычнай школе, куды прывёў і маленькага сына. Яшчэ ў дзяцінстве Паша іграў у аркестры, а пасталеўшы, вырашыў прадоўжыць сямейную традыцыю. Вучыўся ён разам са старэйшай сястрой Кацярыны. Дзяўчына доўга не магла выбраць паміж медыцынай і музыкай, і, у рэшце рэшт, спынілася на другім варыянце.

Кажуць, быццам існуе каханне з першага позірку. А ў нашых герояў атрымалася каханне з першай размовы па тэлефоне... Пазнаёміліся яны восем гадоў таму падчас вучобы ў Наваполацкім дзяржаўным музычным каледжы. Кацярына выпадкова набрала нумар Паўла, і яны разгаварыліся. Пасля гэтая «памылка» перарасла ў каханне.

Закончыўшы каледж, Павел паступіў у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі на факультэт народных інструментаў па спецыяльнасці «Баян-акардэон», а яго абранніца — у БДПУ імя Максіма Танка на спецыяльнасць «Музычнае мастацтва; спецыяльныя музычныя дысцыпліны».

— Каця на два гады маладзейшая за мяне, — распавядае Павел. — І ў яе было скарочанае навучанне — усяго тры гады. Яна вельмі здольная і да вучобы заўжды ставілася адказна — у адрозненне ад мяне, скончыла ВНУ з дыпломам з адзнакай і магла б паступіць і ў кансерваторыю. У такім выпадку мне б давялося чакаць яе два гады. А так мы ў адзін год атрымалі дыпломы і адразу ажаніліся.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 12 2014 г.

Перспектывы

# ЗАСЛУЖЫЎ — АТРЫМАЙ

## Новая сістэма каардынат для педагогаў-прафесіяналаў

**Галіна павінна больш плаціць за кваліфікацыйны ўзровень, каб педагог імкнуўся да павышэння сваёй кваліфікацыі. Памер заробкаў павінен залежаць ад якасці працы. Гэтыя думкі неаднаразова агучваліся ў самых розных аўдыторыях і з самых розных трыбун. З 1 верасня гэтага года памер надбавак за кваліфікацыйныя катэгорыі, нарэшце, быў перагледжаны ў бок павышэння. Надбаўка за вышэйшую катэгорыю ў педагогаў вырасла ўтрая — з 30% да 90% тарыфнага акладу (стаўкі). За першую катэгорыю цяпер даплачваюць 55% ад тарыфнага акладу (стаўкі) замест 20%. За другую катэгорыю — 30% замест 15%. А за катэгорыю «настаўнік-метадыст» — 120% замест 40%.**

**Пра тое, што змянілася для работнікаў галіны пасля ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Інструкцыю аб атэстацыі педагагічных работнікаў, мы гутарым з <u>намеснікам старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раманам ДАПІРАМ:</u>**

### Павышаць катэгорыю ці не?

— Паколькі атэстацыя педагагічных работнікаў перастала быць проста іх правам, а стала яшчэ і абавязкам, першае пытанне, якое паставіў галіновы прафсаюз перад Міністэрствам адукацыі, якое з'яўляецца нашым сацыяльным партнёрам, датычылася павелічэння аплаты за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі. Тым больш што атрыманне і пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі пераўтварылася ў сур'ёзную працэдуру.

Наша пазіцыя была наступнай: памер даплаты павінен стымуляваць педагога да павышэння свайго прафесійнага ўзроўню і прысвоення яму больш высокай кваліфікацыйнай катэгорыі. З 1 верасня даплата перастала быць сімвалічнай. Надбаўка для настаўніка з вышэйшай катэгорыяй складае зараз каля 1 мільёна рублёў, а ў настаўніка-метадыста — каля 1,5 мільёна рублёў.

> **«Калі мы такія прынцыповыя ў пытаннях атэстацыі, тады чаму ў дачыненні да дашкольнай адукацыі допускаем размеркаванне выпускнікоў «не зусім» па спецыяльнасці?»**

**— Вы лічыце, што гэтыя сумы дапамогуць утрымаць у галіне вопытных педагогаў?**

— Да перагляду даплат у многіх узнікалі сур'ёзныя сумненні: а ці шмат знойдзецца ахвотных пацвярджаць сваю вышэйшую катэгорыю за мінімальную прыбаўку да заробку? Першапачаткова на пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі педагогам адводзіўся тэрмін да 1 верасня 2014 года, але педагогі не спяшаліся рабіць гэта ў масавым парадку. Затым Міністэрства адукацыі вырашыла перанесці тэрмін пацвярджэння вышэйшай катэгорыі на 1 верасня 2017 года. Фактычна галоўнае адукацыйнае ведамства расцягнула пераходны перыяд амаль на пяць гадоў з часу ўступлення ў сілу інструкцыі, каб можна было якасна і без спешкі правесці кваліфікацыйныя экзамены.

Прызнаюся, што сёння мы больш аптымістычна глядзім на сітуацыю. Мяркую, што калі перад педагогам паўстане дылема (павышаць катэгорыю ці не павышаць, пайсці на пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі ці не), то ён зробіць свой выбар на карысць павышэння і пацвярджэння. Усё ж такі ў сістэме каардынат аплаты работнікаў бюджэтнай сферы педагогі атрымалі дастаткова адчувальную даплату. Таму не пацвярджаць вышэйшую катэгорыю і такім чынам пагаджацца на зніжэнне сваёй кваліфікацыі да першай катэгорыі будуць нямногія. Але гэта цалкам магчыма ў выпадку з работнікамі ўстаноў адукацыі, якія падпадаюць пад закрыццё, з работнікамі, з якімі наймальнікі не плануюць прадаўжаць працоўныя адносіны, ці з работнікамі, якія самі жадаюць пакінуць галіну. Застаюцца і пытанні па педагогах перадпенсійнага ўзросту: па тых, хто ўжо стаіць на парозе пенсіі сёння ці будзе стаяць на парозе выхаду на пенсію ў 2017 годзе… Наколькі яны могуць быць зацікаўлены ў пацвярджэнні вышэйшай катэгорыі? Ці захочуць праходзіць сур'ёзны кваліфікацыйны экзамен? У тым выпадку, калі педагог-пенсіянер адмовіцца ад пацвярджэння, яго кваліфікацыйная катэгорыя будзе знiжана да першай.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Тым не менш, падчас правядзення «прамых ліній» да нас сталі звяртацца педагогі са стажам, якія пакінулі сістэму адукацыі, але цяпер задумаліся над сваім вяртаннем. Мяркую, гэта красамоўнае сведчанне таго, што калі пачаць вырашаць пытанні з аплатай працы, то можна спадзявацца на тое, што ў сістэму адукацыі стане магчыма вярнуць кваліфікаваныя кадры, якія некалі пакінулі галіну.

### Атэстацыя і аптымізацыя

**— Інструкцыя аб парадку правядзення атэстацыі выклікала ў педагогаў шмат пытанняў…**

— Менавіта таму напрыканцы сакавіка і ў лістападзе гэтага года Міністэрства адукацыі ўнесла ў інструкцыю важныя карэктывы. У асноўным гэтыя змяненні і дапаўненні былі доўгачаканымі для педагагічнай грамадскасці. На многіх карэктывах прынцыпова настойваў галіновы прафсаюз.

Бадай што самым праблемным у новай інструкцыі стаў 20-ы пункт, паводле якога педагог, які пераходзіў з адной пасады на іншую, з адной установы адукацыі ў іншую, мог пазбавіцца сваёй кваліфікацыйнай катэгорыі. Пэўныя карэктывы ўносіў запіс аб «пераводзе» работніка на новую пасаду — толькі ў такім выпадку можна было прэтэндаваць на тую ж кваліфікацыйную катэгорыю на новай пасадзе, што і на ранейшай (без уліку тэрміну працы на новай пасадзе).

Магчыма, калі вялася работа над першым варыянтам інструкцыі, мала хто ўяўляў сабе маштабы аптымізацыі і рэарганізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але па факце сёння многія педагогі вымушаны працаваць не па сваім профілі, а там, дзе для іх знайшлася работа. Закрылася базавая і сярэдняя школы — настаўнікі-прадметнікі вымушаны працаваць у пачатковай школе, выхавальнікамі груп падоўжанага дня або ўвогуле ісці ў сістэму дашкольнай адукацыі. Напрыклад, калі з-за скарачэння настаўнік з вышэйшай катэгорыяй ішоў працаваць выхавальнікам у школу-інтэрнат, у групу падоўжанага дня ці ўстанову дадатковай адукацыі, ён пазбаўляўся сваёй катэгорыі і яму даводзілася пачынаць «кар'еру» фактычна з нуля…

Унясеннем змяненняў і дапаўненняў у пункт 20 інструкцыі фактычна вырашана праблема прызнання наяўнасці кваліфікацыйных катэгорый па адпаведных пасадах педагагічных работнікаў у выпадках змены імі месца працы, пасады і г. д. пры ўмове адпаведнасці кваліфікацыйным патрабаванням. А форма пераходу на новую пасаду зараз не мае значэння. Больш за тое, значна пашыраны пералік пасад, пры змене якіх магчыма прэтэндаваць на ранейшую катэгорыю.

### «Не тая» адукацыя

**— Раман Восіпавіч, вы сказалі, што адна з умоў допуску да атэстацыі — гэта наяўнасць адпаведнай кваліфікацыі. Але менавіта з гэтым пунктам у педагогаў дашкольнай адукацыі ўзнікалі праблемы..**

— Сапраўды, настаўнік фізікі фактычна можа выкладаць матэматыку, а настаўнік хіміі — біялогію. І ніхто яму не скажа, што ён не мае адпаведнай кваліфікацыі, калі кіраўнік дзяржавы даручыць яму выкладанне адпаведнай дысцыпліны. Зусім іншая справа — выхавальнік дашкольнай адукацыі. Гэта іншая пасада са сваёй спецыфікай. І да яе прад'яўляюцца іншыя кваліфікацыйныя патрабаванні, чым да настаўнікаў-прадметнікаў. Яны супастаўныя толькі з кваліфікацыйнымі патрабаваннямі да настаўнікаў пачатковых класаў, паколькі і там, і там маецца на ўвазе наяўнасць вышэйшай ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі па профілі «Педагогіка» (кірунак «Педагогіка дзяцінства») ці педагагічная адукацыя і перападрыхтоўка па кірунку «Педагогіка дзяцінства».

Наймальнік мае права ўзяць асобу з педагагічнай адукацыяй на працу выхавальнікам у дашкольную ўстанову без адпаведнасці гэтым кваліфікацыйным патрабаванням, але атэставаць на прадмет прысвоення кваліфікацыйнай катэгорыі не можа. Калі настаўнік матэматыкі з вышэйшай катэгорыяй прыходзіць на пасаду выхавальніка, ён не можа атрымаць нават другую катэгорыю. І яму трэба прайсці перападрыхтоўку па кірунку «Педагогіка дзяцінства». У той жа час калі ён пройдзе перападрыхтоўку, то зможа прэтэндаваць адразу на вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю ўжо на пасадзе выхавальніка дашкольнай адукацыі. Вось чаму перападрыхтоўка па педагогіцы дзяцінства сёння вельмі запатрабаваная.

Тым не менш, трэба разумець, што бяруць ва ўстановы дашкольнай адукацыі педагогаў без адпаведнай падрыхтоўкі з-за недахопу кадраў. І даволі часта гэтыя педагогі працуюць больш чым на стаўку, бо нават «няпрофільных» спецыялістаў у дашкольных установах не хапае. Адпаведна, вырашыць пытанне замены такіх работнікаў пры накіраванні на перападрыхтоўку таксама складана. Атрымліваецца замкнёнае кола праблем…

Варта памятаць і пра тое, што на шматлікія вакансіі ва ўстановы дашкольнай адукацыі мы размяркоўваем выпускнікоў няпрофільных педагагічных спецыяльнасцяў — напрыклад, філолагаў, гісторыкаў і г. д. Але атэставаць іх таксама будзе немагчыма. Прафсаюз прапаноўваў допускаць іх да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі пры наяўнасці павышэння кваліфікацыі па пасадзе выхавальніка дашкольнай адукацыі.

Сёння ўжо трэба вызначыцца. Калі мы такія прынцыповыя ў пытаннях атэстацыі, тады чаму ў дачыненні да дашкольнай адукацыі допускаем размеркаванне выпускнікоў «не зусім» па спецыяльнасці? У рэшце рэшт, выпускнікі могуць ад такога размеркавання адмовіцца. Каму стане ад гэтага лепш? Таму мы мяркуем вярнуцца да вырашэння гэтай праблемы ў самы бліжэйшы час.

### Дырэктар — таксама педагог

**— А ці ўрэгуляванае пытанне атэстацыі кіраўнікоў устаноў адукацыі? Маю на ўвазе прысваенне ці пацвярджэнне кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічнага работніка…**

— У новай рэдакцыі быў выключаны пункт 21, згодна з якім кіраўнікі ўстаноў адукацыі павінны былі пацвярджаць кваліфікацыйную катэгорыю настаўніка. Зараз маецца на ўвазе, што калі кіраўнік не выконвае педагагічную работу, не мае педагагічнай нагрузкі, то і атэстацыю на пацвярджэнне яму праходзіць не трэба. Калі ж ён мае такую нагрузку і займае пасаду настаўніка, то, як і іншыя педагагічныя работнікі, праходзіць абавязковую атэстацыю на пацвярджэнне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі ці на прысваенне іншай кваліфікацыйнай катэгорыі.

> **«У абавязковы стаж работы працягласцю два гады, неабходны для таго, каб прэтэндаваць на атрыманне другой кваліфікацыйнай катэгорыі, можа быць уключаны і стаж работы падчас вучобы».**

Сёння атэстацыя кіраўнікоў арганізацый сістэмы адукацыі і іх намеснікаў на прысваенне (пацвярджэнне) кваліфікацыйнай катэгорыі педагагічнага работніка магчыма толькі пры ўмове займання імі адпаведнай пасады педагагічнага работніка, гэта значыць, пры наяўнасці працоўнага дагавора па сумяшчальніцтве.

На жаль, але не ва ўсіх выпадках гэта можна рэалізаваць. Дырэктар школы, які паралельна з асноўнай работай мае 5–10 гадзін вучэбнай нагрузкі па сумяшчальніцтве, можа прайсці атэстацыю як настаўнік і атрымліваць кваліфікацыйную надбаўку, а загадчыку дзіцячага садка такую магчымасць не пакінулі. Загадчык мае права толькі працаваць на замене сваіх педагагічных работнікаў, якія часова адсутнічаюць, што ўсё і робіць. На замене загадчыкі ў гарадскіх садках адпрацоўваюць ад 30% да 50% нормы гадзін выхавацеля на стаўку, але гэта не дае ім права атэстоўвацца як выхавацелям. Між іншым, загадчыкамі дашкольных устаноў адукацыі не заўсёды становяцца выхавальнікі з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй, і ў той жа час зараз павысіць свой кваліфікацыйны ўзровень яны не могуць.

У артыкул 255 Працоўнага кодэкса былі ўнесены важныя змяненні: замест слоў «выкладчыцкая работа» там цяпер згадваецца «педагагічная дзейнасць» (у частцы рэалізацыі зместу адукацыйных праграм), таму кіраўнікі могуць займацца педагагічнай дзейнасцю па сумяшчальніцтве. Але ў Закон «Аб барацьбе з карупцыяй» патрэбныя змяненні не ўнеслі. Вось калі антыкарупцыйны закон будзе прыведзены ў адпаведнасць з Працоўным кодэксам, тады нашы кіраўнікі ўстаноў дашкольнай адукацыі атрымаюць поўнае права на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі ў выпадку працы на пасадзе выхавальніка дашкольнай адукацыі па сумяшчальніцтве.

### Маладосць — не перашкода

**— А якія правы ёсць у маладых спецыялістаў?**

— Увогуле пры допуску да атэстацыі дзейнічаюць наступныя ўмовы. Першая — гэта адпаведнасць кваліфікацыйным патрабаванням. Другая — наяўнасць пэўнага стажу.

Інструкцыяй устаноўлена, што прэтэндаваць на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі могуць педагагічныя работнікі, якія маюць стаж працы на пасадзе, па якой атэстуюцца, два гады. Але ёсць і выключэнні. Асобы, якія атрымалі дыплом аб вышэйшай адукацыі з адзнакай, дыплом магістра ці дыплом даследчыка, допускаюцца да атэстацыі на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі пры наяўнасці стажу работы адзін год. Гэта значыць, што ўжо праз год, як пачалі працаваць, яны маюць права падаваць заяву на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі.

Цікавы момант: у абавязковы стаж работы працягласцю два гады, неабходны для таго, каб прэтэндаваць на атрыманне другой кваліфікацыйнай катэгорыі, можа быць уключаны і стаж работы падчас вучобы. Не сакрэт, што многія студэнты пачынаюць працаваць яшчэ ў час атрымання педагагічнай адукацыі. І іх работа можа быць уключана ў абавязковы стаж працягласцю два гады. Прычым гэта можа быць работа з любой нагрузкай: на чвэрць, палову стаўкі і гэтак далей. Іншымі словамі, калі студэнт, напрыклад, на працягу двух апошніх курсаў працаваў у школе па сваёй спецыяльнасці, добра зарэкамендаваў сябе, а пасля заканчэння ВНУ ўладкаваўся на работу ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю, то ён можа прэтэндаваць на атрыманне другой кваліфікацыйнай катэгорыі фактычна адразу пасля таго, як прыступіў да працы.

Акрамя таго, дзякуючы апошнім змяненням у інструкцыі, маладыя спецыялісты, якія атрымаюць другую кваліфікацыйную катэгорыю, у аналагічным "паскораным" рэжыме, змогуць прэтэндаваць на прысваенне першай катэгорыі ўжо праз два гады пасля прысвоення другой. Раней гэты тэрмін расцягваўся на тры гады.

**— Ці засталіся ў сферы атэстацыі пытанні, якія яшчэ патрабуюць свайго вырашэння?**

— Асноўнай задачай для прафсаюза лічу вырашэнне кола пытанняў атэстацыі педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі. Таксама застаецца нявырашаным пытанне атэстацыі кіраўнікоў фізічнага выхавання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Яны ў нас не катэгарыруюцца, у адрозненне ад настаўнікаў фізічнага выхавання, таму гэты прабел таксама трэба ліквідаваць.

Мабыць, надышоў час і для прапрацоўкі пытання прадастаўлення права на прысваенне кваліфікацыйнай катэгорыі выкладчыкам устаноў вышэйшай адукацыі, якія не маюць вучоных ступеняў і званняў… Увогуле шмат найбольш праблемных пытанняў ужо зняты. Прычым яны вырашыліся на карысць педагогаў, але практыка заўсёды ставіць перад намі новыя праблемныя задачы… Таму працэс удасканалення нарматыўнай базы будзе працягвацца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Ведай лепшых!*

# У валанцёра — добрае сэрца

**У Зале алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца».**

Сёлета пераможцам у намінацыі «Лепшы валанцёрскі атрад» прызнаны атрад «Рух наперад» («Продвижение») пярвічнай арганізацыі БРСМ Остpынскай СШ імя А.С. Пашкевіч Шчучынскага раёна. У намінацыі «За асабісты ўклад» адзначана Наталля Зубрыцкая, кіраўнік валанцёрскага атрада «Юны валанцёр» пярвічнай арганізацыі СШ №3 г. Шчучына. Па меркаванні арганізатараў конкурсу, «Лепшае масавае мерапрыемства» сёлета правёў валанцёрскі атрад «Эра міласэрнасці» пярвічнай арганізацыі БРСМ Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа, за што і быў узнагароджаны ў адпаведнай намінацыі. Валанцёрскі атрад «Фізік» пярвічнай арганізацыі БРСМ з правамі раённага камітэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны быў ушанаваны ў намінацыі «Лепшая сацыяльная рэклама». «Валанцёрскія справы — у фотааб'ектыве» найлепш атрымалася адлюстраваць у валанцёрскага атрада «Мы — дзецям!» пярвічнай арганізацыі БРСМ з правамі раённага камітэта Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.




Па словах першага сакратара ЦК БРСМ Ігара Бузоўскага, валанцёрскі рух — прыярытэтны кірунак дзейнасці грамадскага аб'яднання. Пачынаючы са студзеня гэтага года, у розных этапах конкурсу «Валанцёр года — Добрае Сэрца» ўзялі ўдзел 380 валанцёрскіх атрадаў БРСМ. Валанцёры аказваюць шэфскую адрасную сацыяльную падтрымку ветэранам і інвалідам вайны і працы, адзінокім пажылым людзям, дзецям-інвалідам, дзецям-сіротам, займаюцца добраўпарадкаваннем храмаў і манастыроў.... Працавалі валанцёры і на чэмпіянаце свету па хакеі ў Мінску.

А ў верасні гэтага года БРСМ атрымаў акрэдытацыю ў Еўрапейскай валанцёрскай службе.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Вось такія «тугрыкі»*

# ШТО СТАРШАКЛАСНІКІ ВЕДАЮЦЬ ПРА ГРОШЫ?

## У краіне адбылася першая рэспубліканская алімпіяда па... фінансавай адукаванасці

**Які дэпазіт лепш выбраць? Колькі працэнтаў па крэдыце трэба заплаціць? Як дасягнуць прыбытковасці? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні шукалі не сямейныя дарослыя людзі, а звычайныя старшакласнікі. З усёй краіны іх сабралі разам у Нацыянальным банку, каб праверыць веды аб грошах.**

Нядаўна Нацбанк і Міністэрства адукацыі зацвердзілі план мерапрыемстваў па супрацоўніцтве ў павышэнні фінансавай адукаванасці навучэнцаў. Прадугледжана, у прыватнасці, правядзенне штогадовых алімпіяд па фінансавай адукаванасці ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Сёлета пераможцы раённых і абласных конкурсаў — больш за 20 юнакоў і дзяўчат — сталі ўдзельнікамі першай рэспубліканскай алімпіяды. Плануецца, што яна стане штогадовай. Пытанні будуць дапрацоўвацца з улікам сітуацыі ў фінансавай сферы.

Перад пачаткам спаборніцтваў **старшыня праўлення Нацыянальнага банка Надзея ЕРМАКОВА** звярнулася да маладых людзей і сказала, што кваліфікаваныя эканамісты вельмі патрэбны як у банкаўскай сферы, так і на прадпрыемствах. А **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ** адзначыў, што веды ў фінансавай сферы, як і знаёмства



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Сучасныя школьнікі ведаюць, што з грашыма нельга гуляць, а трэба правільна імі распараджацца.**

адно з адным, у любым выпадку спатрэбяцца ўдзельнікам праекта ў будучыні.

Прыемнай навіной для школьнікаў стала заява Надзеі Ермаковай аб тым, што пераможцы рэспубліканскіх алімпіяд па фінансавай адукаванасці могуць атрымаць прэферэнцыі пры паступленні на эканамічныя спецыяльнасці ў ВНУ. Пакуль гэта толькі планы, але арганізатары ўпэўнены ў верагоднасці прыняцця такога рашэння. Будучыя студэнты пасля такіх слоў значна ажывіліся і з энтузіязмам пачалі рашаць задачы алімпіяды. Як пасля высветлілася, удзельнікі ў цэлым добра выканалі заданні. Але былі і праблематычныя моманты. Напрыклад, усе ведалі, што пры куплі нечага ў інтэрнэце нельга ўводзіць ПІН-код карткі, а вось з тэрмінам «франшыза» ці «лізінг», відавочна, ім яшчэ не даводзілася сутыкацца. Некаторыя не ведалі, што тугрык з'яўляецца нацыянальнай валютай Манголіі.

У выніку пераможцам алімпіяды стаў брастаўчанін Дзмітрый Уснарскі. На другім месцы з маленькім адрывам ад пераможцы ішоў Глеб Несцяронак з Наваполацка. Трэцяе месца заняла Марыя Вольская з Брэста.

***

Зацверджаны Нацбанкам і Мінадукацыі план разлічаны на бліжэйшыя чатыры гады і заклікаsuccessful ўкараніць элементы фінансавай адукаванасці ў вучэбную праграму. Сярод асноўных пунктаў — распрацоўка і рэалізацыя інавацыйнага праекта, накіраванага на фарміраванне фінансавай адукаванасці як адной з кампетэнцый вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, правядзенне маніторынгу ўзроўню фінансавай граматнасці навучэнцаў. Плануюцца распрацоўка і выпуск вучэбна-метадычных дапаможнікаў па фінансавай адукаванасці, удзел у распрацоўцы настольных фінансава-эканамічных гульняў, стварэнне электроннай энцыклапедыі для навучэнцаў на Адзіным інтэрнэт-партале фінансавай адукаванасці насельніцтва http://www.fingramota.by.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

*Тэхналогіі*

# «ТЭСЦІРУЕМ» НОВУЮ ПРАФЕСІЮ



**Першыя слухачы курса «Асновы тэсціравання» ўжо атрымалі сертыфікаты міжнароднага ўзору.**

**Паколькі жыццё студэнтаў тэхнічнай ВНУ лёгкім не назавеш, кампанія A1QA (ЗАТ «Тэхналогіі якасці») вырашыла спрасціць задачу не толькі ім, але і сабе: днямі ў БДУІР адкрыўся сумесны вучэбны цэнтр па падрыхтоўцы спецыялістаў у тэсціраванні праграмнага прадукту і кантролю якасці праграмнага забеспячэння.**

Сёння патрэба ІТ-кампаній у такіх спецыялістах надзвычай высокая, аднак у беларускіх ВНУ прафесійная падрыхтоўка тэсціроўшчыкаў пакуль не наладжана. Прасцей кажучы, для таго, каб стаць тэсціроўшчыкам, проста дыплома БДУІР будзе недастаткова. Усё роўна выпускнікам, якія будуць прэтэндаваць на гэту работу, давядзецца дадаткова навучацца ў адукацыйным цэнтры ці на курсах. Напрыклад, пры кампаніі A1QA дзейнічае адукацыйны цэнтр «Планета тэсціравання», аднак студэнтам куды больш зручна атрымліваць дадатковую спецыяльнасць, так бы мовіць, паралельна з асноўнай вучобай. А кіраўніцтва кампаніі, у сваю чаргу, атрымлівае магчымасць не толькі актыўна рэкламаваць прафесію тэсціроўшчыка, але і прыглядзець для сябе найбольш перспектыўных студэнтаў.

— Тэсціраванне — гэта новая прафесія. Тэсціроўшчыкі працуюць побач з праграмістамі, але задачы ў іх іншыя, — падкрэсліває **дырэктар кампаніі A1QA Святлана ПРАЎДЗІНА.** — Паколькі карыстальнікамі праграмнага забеспячэння з'яўляюцца і хатнія гаспадыні, і дзеці, і людзі творчых прафесій, усіх іх трэба зразумець, адчуць, наколькі ім камфортна будзе выкарыстоўваць тую ці іншую новую праграму. Таму ў прафесіі тэсціроўшчыка ёсць ніша і для людзей без вышэйшай тэхнічнай адукацыі, але з аналітычным мысленнем.

У студэнтаў, якія пройдуць гэты спецкурс, будзе магчымасць адчуць на сабе ўсе нюансы работы тэсціроўшчыка і вызначыцца з тым, ці падыходзіць такая работа для іх. У любым выпадку атрыманне дадатковых ведаў стане добрым крокам наперад у пабудове іх кар'еры.

Вучэбны цэнтр, да слова, адкрыўся на кафедры інжынернай псіхалогіі і эрганомікі факультэта камп'ютарнага праектавання, але прызначаны ён для практычных заняткаў студэнтаў усяго ўніверсітэта.

— Асноўны трэнд БДУІР — гэта практыкаарыентаваная падрыхтоўка, — нагадвае **першы прарэктар Анатоль ВОСІПАЎ.** — І гэта ўжо 39-ы сумесны праект БДУІР з вядучымі беларускімі і замежнымі кампаніямі. З задавальненнем зазначу, што назва кампаніі ЗАТ «Тэхналогіі якасці», якая стала партнёрам БДУІР, вельмі пасуе нашай ідэалогіі якасці.

Першыя 30 студэнтаў ВНУ ўжо прайшлі двухмесячнае навучанне ў цэнтры і атрымалі сертыфікаты міжнароднага ўзору. Штогод тут плануецца навучаць некалькі сотняў студэнтаў, аспірантаў і магістрантаў. Акрамя таго, спецыяльны курс будзе арганізаваны для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў ВНУ. У сумесным вучэбным цэнтры будуць таксама праходзіць майстар-класы, «круглыя сталы» і іншыя навучальныя мерапрыемствы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### ДАВЕДКА «ЧЗ»

**Абавязкі тэсціроўшчыка:**
**— кантроль якасці праграмных прадуктаў;**
**— выяўленне і аналіз памылак і праблем, якія ўзнікаюць у карыстальнікаў пры рабоце з праграмнымі прадуктамі;**
**— распрацоўка аўтатэстаў;**
**— распрацоўка сцэнарыяў тэсціравання;**
**— дакументаванне знойдзеных дэфектаў;**
**— складанне тэхнічнай дакументацыі на рускай і англійскай мовах.**

## З пошты Чырвонкі ЧЗ

### ЗРАБІ ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР!

***Маргарыта МАЛАШКА, вучаніца 11 класа СШ №12 г. Слуцка:***

**У гарадскім Доме культуры моладзі нашага горада прайшло ток-шоу «Я не хачу паміраць» у рамках праграмы «За здаровы лад жыцця». На яго быў запрошаны ВІЧ-інфіцыраваны чалавек, які выступаў ананімна, схаваўшы твар пад маскай.**

Ён расказаў, што некаторы час ужываў наркотыкі, не здагадваючыся, якімі могуць быць наступствы. Аднойчы яму давялося здаваць аналізы. Вынікі былі сумныя: урачы паведамілі, што ён ВІЧ-інфіцыраваны.

Павучальным для прысутных хлопчыкаў і дзяўчынак быў не толькі аповед гэтага чалавека, але і сцэнка «На ростанях». У ёй расказвалася пра хлопца, які ўжываў наркотыкі, меў выпадковыя бязладныя палавыя сувязі. Але, супаставіўшы ўсе «за» і «супраць», у выніку зрабіў правільны выбар: трэба весці здаровы лад жыцця.

### ЗА БУДУЧАЕ БЕЗ НАРКОТЫКАЎ

***Крысціна БАРЫСАВА, студэнтка I курса кафедры журналістыкі МДУ імя А. Куляшова:***

**«У навінах перадалі, што ў краіне ўчора ад ужывання спайсу памёр яшчэ адзін хлопец. Глядзі! Будуць незнаёмыя людзі прапаноўваць камусьці нешта перадаць — адмаўляйся. Падставяць так — убачыш «неба ў клетачку!» Гэтак, мабыць, ужо ў пяты раз за апошні час выгаворвала мне бабуля, калі мы ў чарговы раз селі піць гарбату.**

«Так, я ведаю пра небяспеку, ведаю, бабуля! Неяк і без іх мяне задавальняюць жыццёвыя радасці. Не турбуйся», — гэтак жа ў пяты раз адказваю ёй.

З розных крыніц даведалася, што даволі шмат хлопчыкаў і дзяўчынак, якія штодня трапляюцца мне на вочы, паспелі паспрабаваць гэты дурман. Многіх з іх ведаю асабіста, таму падумаць не магла, што ім спатрэбіцца ГЭТА! Не буду казаць, што раней не ўсведамляла, чым небяспечныя спайсы, але, прачытаўшы пасля размовы з бабуляй некалькі артыкулаў па тэме, доўга супакойвала «мурашак» на скуры. Думка, што з кім-небудзь са знаёмых, якіх я ведаю, можа здарыцца тое ж, што і з хлопцам з выпуску навін, не давала спакою.

Што стаіць за гэтай праблемай: адсутнасць увагі з боку бацькоў, лішнія грошы ці проста цікаўнасць да ўсяго забароненага? Мабыць, усё пералічанае ў той ці іншай ступені. Пытанне ў іншым: як спыніць? Бацькі, сябры, бальніцы не вырашаць праблему за самога чалавека. Выбар — толькі за ім.

### НАША МОЛАДЗЬ — САПРАЎДНЫ ФЕНОМЕН СУЧАСНАСЦІ

***Канстанцін КАРНЯЛЮК, педагог, г. Віцебск:***

**Гэта проста цудоўная навіна, што новы 2015 год абвешчаны ў нашай краіне Годам моладзі. Нельга не заўважыць, што наша моладзь — няўрымслівая і крэатыўная, яна не стаіць на месцы і пастаянна развіваецца і ўдасканальваецца, увесь час прыдумваючы новыя ідэі і праекты. І такім чынам назапашваючы той самы дарослы вопыт і нярэдка ў многім абганяючы нас, дарослых.**

Мне ўзгадваецца выпадак, калі выпускнік тэхнічнага ўніверсітэта за тыдзень зрабіў праект, над якім «карпелі» амаль квартал «вопытныя» інжынеры праектнага інстытута... А колькі карысных спраў праводзіць БРСМ, нягледзячы на тое, што знаходзіцца шмат тых, хто крытыкуе гэтую арганізацыю! Вельмі добра, што маладых суайчыннікаў хвалюе, як зрабіць сваё жыццё яшчэ больш духоўна разнастайным і насычаным, скіраваным на здаровы лад жыцця і карысць краіне, развіццё творчага патэнцыялу.

Як педагог, я перакананы: моладзь — генератар многіх важных ідэй. Ды і дзяржава пастаянна клапоціцца аб тым, каб развіваць творчы, навуковы і прафесійны патэнцыял моладзі, актыўна прыцягваць маладых да здзяйснення шматлікіх сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў. Мы, дарослыя, педагогі, павінны актыўна штодзённа дапамагаць юнакам і дзяўчатам, станавіцца для іх духоўнымі настаўнікамі, выхоўваць у юных высакародныя пачуцці патрыятызму і грамадзянскай адказнасці. І вельмі добра, што ў нас менавіта маладзёжная палітыка з'яўляецца прыярытэтным кірункам дзяржаўнай дзейнасці. Упэўнены: моладзь Беларусі — гэта сапраўдны феномен сучаснасці, незвычайны згустак энергіі, здароўя, прагматызму і інтэлектуальнасці.

**Лісты чытаў Сяргей РАСОЛЬКА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 12 2014 г.

Свой выбар

# «БАЧУ МЭТУ — ДУМАЮ ПРА «СТРАЛУ»,

## ці Дзень дзяжурства з «даішнікам»



**Інспектар ДАІ — адна з тых прафесій, што ахутаны вялікай колькасцю стэрэатыпаў і штампаў, часам зусім непраўдзівых. Але людзі, гатовыя прысвяціць жыццё ахове бяспекі на дарогах, заўжды знаходзяцца. Малады супрацоўнік аддзела ДАІ Першамайскага раёна сталіцы, інспектар дарожна-патрульнай службы Эдуард ВЯРЛАНАЎ з іх ліку. Карэспандэнты «Чырвонкі» папрацавалі на вуліцах Мінска разам з інспектарам і ўбачылі працу «даішніка» знутры.**

Працоўны дзень пачынаем разам з Эдуардам у Першамайскім аддзеле ДАІ. Звычайна інспектары працуюць у пары, але для нас сёння робяць выключэнне: замест напарніка ў аўтамабіль садзіцца журналісты.

— Я завочна вучыўся на факультэце права ў Акадэміі МУС, — расказвае Эдуард, кіруючы машынай, — потым працаваў на рэгістрацыі транспарту. З 2010 года — інспектар. Аб чым марыў у дзяцінстве? Не памятаю, але дакладна не пра ДАІ *(смяецца)*. У цэлым праца мне падабаецца. Бываюць цяжкія дні, бываюць больш лёгкія. Звычайны працоўны дзень — 9 гадзін.

**«Калісьці бачыў затрыманне п'янага кіроўцы трактара, што чысціць снег. Мужчына нападпітку прыехаў прыбіраць тэрыторыю... аддзялення ДАІ».**

Па словах Эдуарда, з загадзя варожым стаўленнем кіроўцаў да супрацоўнікаў ДАІ ён сустракаецца даволі рэдка. Нават самыя недысцыплінаваныя аматары хуткай язды — матацыклісты — у большасці выпадкаў самі спыняюцца па патрабаванні інспектара і пагаджаюцца са сваімі парушэннямі.

— Часам спыняеш для праверкі дакументаў даволі дарагія аўтамабілі, — разважае Эдуард, — і амаль усе іх кіроўцы паводзяць сябе вельмі інтэлігентна. Сварыцца звычайна пачынаюць тыя, ад каго ты менш за ўсё гэтага чакаеш. Разумны чалавек усведамляе, што ніякай перадузятасці ў мяне няма, мы бачымся ў першы і, хутчэй за ўсё, у апошні раз. Інспектар ставіцца роўна да ўсіх. Хочацца чакаць таго ж самага і ад кіроўцаў.

Усіх супрацоўнікаў ДАІ трымаюць «у форме»: раз у тры месяцы яны праходзяць абавязковую атэстацыю па Правілах дарожнага руху. Дарэчы, часам і самім інспектарам даводзіцца выступаць у ролі настаўнікаў: за кожным замацавана школа,



дзіцячы садок і адна з дзяржустаноў раёна. Супрацоўнікі ДАІ праводзяць там заняткі, на якіх расказваюць пра самае важнае ў Правілах дарожнага руху і адказваюць на пытанні аўдыторыі.

...У першыя хвіліны патрулявання здаецца, што словы пра дысцыплінаванасць беларускіх кіроўцаў — чыстая праўда. Рыхтуемся да таго, што парушальнікаў будзе няшмат.

— Вядома ж, ніякага «плана па штрафах» у нас няма, — кажа Эдуард. — Але калі ты сістэматычна вяртаешся з дзяжурства з пустой папкай, узнікае лагічнае пытанне: «Чым жа ты ўвесь гэты час займаўся?»

Накіроўваемся на вуліцу Карбышава, дзе меркаванне аб добрай дысцыпліне на дарогах адразу ж разбураецца: чатыры пратаколы літаральна за 20 хвілін! Першыя два чалавекі ігнаруюць падвойную суцэльную лінію і разварочваюцца проста пасярод дарогі. Абодва адразу прызнаюць сябе вінаватымі, а ўбачыўшы ў машыне карэспандэнтаў, пачынаюць усміхацца і ахвотна ўступаюць у размову.

Неўзабаве становімся сведкамі зусім дзіўных паводзін: пакуль Эдуард запаўняе пратакол на аднаго з кіроўцаў, да суседняй машыны падыходзіць малады чалавек. Адчыняе дзверы, нешта забірае і, уважліва паглядзеўшы на машыну ДАІ, — перабягае праезную частку. Пры гэтым бліжэйшы пераход — усяго за 30 метраў адсюль!

**«Не заставалася ніякіх варыянтаў, акрамя выкарыстання зброі: спачатку страляў у паветра, потым — па колах. Дарэчы, нават з прастрэленымі шынамі ён не збіраўся спыняцца, але пасажыры ў салоне заглушылі рухавік».**

...Рухаемся далей і размаўляем аб вольным часе супрацоўніка ДАІ. Галоўная цікавасць Эдуарда па-за працай — спорт. Жаданне займацца фізічнай культурай толькі вітаецца — у іх распараджэнні ўласная спартыўная і трэнажорная залы, дзе кожны выбірае тое, што яму больш па душы. Эдуард аддае перавагу гульнявым відам спорту — тэнісу і футболу.

— Калі казаць пра калектыў, то адносіны з калегамі ў мяне вельмі добрыя, — кажа суразмоўца. — Я нават сказаў бы — сяброўскія. Мы разам займаемся спортам, разам адпачываем: на рыбалцы, паляванні, у кавярнях. Ні пра якія працоўныя канфлікты нават размовы не ідзе.

Эдуард кажа, што найцяжэйшае ў працы — ДТЗ. Асабліва тады, калі аварыі суправаджаюцца траўмамі ці нават лятальнымі выпадкамі. Гэта цяжка ў першую чаргу маральна. Хлопец стараецца не сачыць за лёсам людзей, якія пацярпелі на дарозе, але час ад часу на вочы трапляюцца вянкі на знаёмых месцах...

— Асабліва не люблю дні, калі шмат дробных ДТЗ, — кажа Эдуард. — На кожнае трэба прыехаць, скласці пратакол... На яго афармленне ідзе больш чым гадзіна. А ў іншым месцы, дзе адбылося нешта сапраўды сур'ёзнае, людзі будуць чакаць. Пры тым, што зараз існуе магчымасць самастойнага афармлення ДТЗ па бланку, без удзелу супрацоўніка ДАІ.

Не абыходзіцца на працы і без экстрыму — без пагоняў за парушальнікамі. Са свежых выпадкаў Эдуард узгадвае пераслед угоншчыка на старэнькіх «Жыгулях». Раней судзімы за крадзеж зламыснік, які, як потым аказалася, быў яшчэ і п'яны, рушыў у бок кальцавой. Кіроўца на хуткасці 150-170 кіламетраў у гадзіну ўцякаў ад пяці экіпажаў ДАІ. Затрымаць яго ўдалося толькі у вёсцы Сеніца пад Мінскам. Там ён кінуў аўтамабіль і спрабаваў схавацца ў лесе.

— Даводзілася нават страляць, — распавядае інспектар. — У першы год працы быў такі выпадак: ва Уруччы п'яны кіроўца не спыняўся, тройчы тараніў службовую машыну ДАІ. Некалькі разоў ствараў аварыйную сітуацыю, мог наехаць на пешаходаў. Не заставалася ніякіх варыянтаў, акрамя выкарыстання зброі: спачатку страляў у паветра, потым — па колах. Дарэчы, нават з прастрэленымі шынамі ён не збіраўся спыняцца, але пасажыры ў салоне заглушылі рухавік. Абышлося без ахвяр. У той жа час бываюць і «вясёлыя» выпадкі. Калісьці бачыў затрыманне п'янага кіроўцы трактара, што чысціць снег. Мужчына нападпітку прыехаў прыбіраць тэрыторыю... аддзялення ДАІ.

...За пару гадзін адбываецца нечаканае — пратаколы заканчваюцца. Вось табе і дысцыплінаваныя кіроўцы... Рухаемся да месца пачатку нашага падарожжа, задаём апошнія пытанні.

— Галоўная перавага маёй працы — гэта актыўнасць. Ніколі не сядзіш на месцы, рухаешся, кожны дзень нешта новае. Што важна, ёсць перспектыва росту. Хачу спачатку атрымаць званне капітана (зараз Эдуард — старшы лейтэнант міліцыі). Магчыма, калі-небудзь атрымаецца папрацаваць у спецпадраздзяленні «Страла». У любым выпадку я бачу сваю будучыню толькі ў ДАІ.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# АД МУЗЫКІ ДА МАГІІ — АДЗІН КРОК

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Варыянтаў — куды паехаць па размеркаванні — у маладой сям'і было няшмат: Лагойск і Мазыр. У Лагойску Паўла і Кацярыну адразу ж паставілі перад фактам: тут жылля не знайсці. Затое ў Мазыры прадстаўлялі інтэрнат — якраз праз дарогу ад Музычнага каледжа. Так Лаўцы перабраліся на Палессе і пра свой выбар не пашкадавалі. Адпрацаваўшы ўсяго год па размеркаванні, сям'я маладых спецыялістаў атрымала службовае жыллё — двухпакаёўку ў новым раёне. Ім вельмі пашанцавала, бо свабодных памяшканняў на той момант не было. Калі б зацягнулі з гэтай справай, кватэра была б арэнднай, і, акрамя «камуналкі», давялося б плаціць яшчэ і за арэнду. Раён, дзе яны жывуць, празвалі «маладзёжным», бо ў новабудоўлі ўязджаюць адны маладыя.

### ЦІ СЛУХАЮЦЦА ДЗЕЦІ «ЗЯЛЁНАГА» НАСТАЎНІКА?

Зараз Павел выкладае баян і акардэон як дадатковыя інструменты ў музыкантаў-дамрыстаў, а чацвёртакурснікаў вучыць на слых аналізаваць мелодыю, яе рытмічныя асаблівасці. Аднак на выкладчыцкай дзейнасці яго праца не заканчваецца: таксама іграе ў ансамблі настаўнікаў у дзіцячай школе мастацтваў, якая знаходзіцца пад Мазыром, у вёсцы Казенкі. Зарплата ў каледжы — 3 мільёны. Жонка атрымлівае дапамогу па доглядзе дзіцяці — 2,2 мільёна рублёў. Не так і многа на траіх, таму малады тата заняты з восьмай раніцы да дзявятай вечара. І пры гэтым паспявае выступаць у музычным ансамблі народнай музыкі «Явар».

Кацярына занята выхаваннем дачушкі. Да дэкрэтнага адпачынку яна працавала ў мазырскай дзіцячай музычнай школе №1. Павел жонку хваліць:

— Сама яна выдатніца, хаця гэта не галоўнае. Каця добра адчувае малых і ўмее ладзіць з імі. Не паверыце, але вучні плакалі, калі жонка сыходзіла ў дэкрэт.

У Паўла Ігаравіча сітуацыя больш «складаная»: яго вучні — падлеткі ад 15 да 19 гадоў.

— Ёсць і малайцы, і гультаі, — ахвотна дзеліцца назіраннямі малады выкладчык. — У мяне свая выхаваўчая



**«Сам нядаўна быў такім жа «зялёным», як і мае вучні».**

**Аднойчы яны разам з партнёрам сваёй ілюзіяй «за раз» зарабілі вялікую суму — і хлопец набыў заручальны пярсцёнкі.**

методыка яшчэ не наладжана, але я ведаю, што падмурак усяго — давер. Стараюся быць паблажлівым, бо разумею: сам нядаўна быў такім жа «зялёным», як і мае вучні. Самі бачыце, выглядаю я молада і не заўжды вучні прызнаюць ува мне настаўніка, старэйшага за іх.

Затое ў калектыў малады выкладчык «уліўся» адразу. Так ужо заведзена ў каледжы: калі прыходзіць малады спецыяліст, за ім адразу замацоўваюць куратара, які дапамагае навічку хутка асвоіцца на новым месцы.

### ЦВІК У НОСЕ І... ПРАГРАМАВАННЕ

На маё пытанне — ці не задумвалася маладая сям'я музыкантаў стварыць уласны праект — Павел хітравата ўсміхнуўся:

— Ведаеце, яшчэ пяць гадоў таму я захапіўся напісаннем музыкі для рэкламы ў праграме Cubase — атрымліваюцца фонавыя мелодыі, якія мы чуем і ў кінастужках, і ў звычайнай рэкламе. Пішу фанаграмы для музычнай школы. Невялікі прыбытак з гэтай дзейнасці ёсць, але яшчэ трэба ўдасканальвацца. Не хапае памяшкання і часу, хаця для такой музыкі патрабуецца мінімум абсталявання: камп'ютар, спецыяльная клавіятура, студыйныя маніторы і гукавая картка.

Праўда, ёсць і адваротны бок медаля: жонка стала праціўіцца захапленню, бо муж «знікае» за маніторам на гадзіны. Але музыка аказалася не адзінай «жарсцю» ў жыцці Паўла.

— Люблю фокусы паказваць, — адзначае хлопец. — З дзяцінства захапляюся майстэрствам Дэвіда Каперфільда. Калі вучыўся ў Мінску, то пазнаёміўся з ілюзіяністам Арсенам Мелкаянам і ён навучыў мяне некаторым картачным хітрыкам. Напрыклад, з яго дапамогай я асвоіў трук «нябачная калода»: глядач загадвае пра сябе сваю карту, а пасля яна аказваецца адзінай перакуленай картай у новай, цалкам запячатанай калодзе.

Фокусы сталі не проста хобі, а яшчэ і падпрацоўкай: у сталіцы Павел дэманстраваў сваю магію на вяселлях. Аднойчы яны разам з партнёрам сваёй ілюзіяй «за раз» зарабілі вялікую суму — і хлопец набыў заручальныя пярсцёнкі. Пра ўсе свае захапленні ён можа распавядаць гадзінамі і таму падчас гутаркі зазначыў: «Будзе, хутчэй, матэрыял пра фокусы, а не пра мяне». Сапраўды, у інтэрнэт-прасторы захоўваецца відэа з Паўлам «Цвік у носе», дзе музыкант выконвае цікавы трук.

Аказалася, што Павел плануе вучыцца і далей: малады выкладчык хоча атрымаць кваліфікацыю праграміста і таму збіраецца паступаць у БДУІР на перападрыхтоўку на базе вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «Вэб-дызайн і камп'ютарная графіка». У яго столькі занняткаў, што вольнага часу амаль няма. Лепшы адпачынак — дома, разам з жонкай і дачкой... Пакуль Павел і Кацярына вырашылі застацца ў Мазыры, а там — як «карта ляжа».

**Кацярына РАДЗЮК.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Мінск — Мазыр — Мінск.*

*Жывая легенда*

# З рызыкай на «ты»

## Ён падаў у кратар вулкана і прызямляўся ў джунглях

**Са знакамітым расійскім экстрэмалам Валерыем Розавым мы сустрэліся раніцай у адной са сталічных кавярняў. Графік яго мерапрыемстваў настолькі шчыльны, што размаўляць прыходзіцца за сняданкам. У вачах славутага 49-гадовага парашутыста, двухразовага чэмпіёна свету па парашутным спорце, чытаецца стома. Учора ён правёў лекцыю для студэнтаў БДУ, якую некалькі разоў спынялі авацыямі, прадэманстраваў дакументальны фільм аб узыходжанні на Эверэст, а сёння паспеў ужо з'ездзіць на тэлебачанне. Але, нягледзячы на стомленасць, Валерый бадзёра адказвае на пытанні, цытуе Высоцкага і раіць паглядзець некалькі добрых фільмаў пра горы.**

### «Заўжды марыў стаць альпіністам»

***— Валерый, ваша жонка таксама займалася экстрэмальным спортам — скалалажаннем, удзельнічала ў вашых экспедыцыях. А вось сыны чамусьці сталі прыхільнікамі воднага пола...***

— А навошта займацца небяспечным альпінізмам, калі ёсць нармальныя заняткі? Тым больш воднае пола — добрая камандная гульня, якая развівае арганізм. Старэйшы сын трапіў у гэты від спорту выпадкова, але ў яго адразу пачало атрымлівацца. Сярэдні пайшоў ужо па накатаным шляху. У выніку хлопцы выйшлі амаль што на прафесійны ўзровень.

***— Вашы савецкія аднагодкі марылі стаць касманаўтамі і міліцыянерамі, машыністамі і вайскоўцамі, а вы...***

— Заўжды марыў стаць альпіністам. У школе вучыўся добра. Скончыў яе з залатым медалём, а ў горы пайшоў дзякуючы старэйшаму брату. У свой час ён узяў мяне разам з сабой у паход на Каўказ, у горы, якія я вельмі люблю. Гэты выпадак моцна паўплываў на маё далейшае жыццё.

***— Ваш суайчыннік Альберт Дземчанка, трохразовы прызёр Алімпійскіх гульняў па саначным спорце, тры гады гандляваў мясам на рынку. А вас жыццё прымушала працаваць не па спецыяльнасці?***

— Так, пэўны час, каб зарабіць, мне прыходзілася працаваць у Расіі высотным альпіністам. Што рабіў? Вісеў на вяроўцы, мыў вокны і герметызаваў шчыліны ў дамах.

### «Скачок у вулкан эпахальным не лічу»

***— Колькі часу на працягу года атрымліваецца праводзіць на радзіме?***

— У сярэднім паўгода. Праўда, ніхто цябе не рэгламентуе ў часе. Ты сам плануеш сваё жыццё. Што тычыцца ўмоў, для бэйсджампінгу (скачкоў з парашутам з фіксаваных аб'ектаў) працэй трэніравацца ў Альпах. Безумоўна, ёсць для падобных скачкоў добрыя месцы і ў нашых гарах, аднак там дрэнная інфраструктура. Каб патрапіць на кропку для скачка, неабходна арганізаваць маленькую экспедыцыю. Але да іх не пракладзены дарогі, няма нават горных сцежак і карт.

***— Пры гэтым адзін са сваіх знакамітых скачкоў у касцюме-«крыле» вы зрабілі менавіта ў Расіі. Пяць гадоў таму відэа вашага палёту ў жарало дзейнага вулкана абляцела літаральна ўвесь свет...***

— Толькі для мяне скачок у кратар вулкана не з'яўляецца эпахальным. Усё гэта нагадвае гісторыю музыкантаў, якія, на іх думку, запісалі праходную песню, а яна нечакана стала хітом. Так і тут. У мяне ёсць шмат добрых скачкоў, напрыклад, у Патагоніі, аднак пра іх ніхто не ўзгадвае.

***— Проста многія і сёння думаюць, што кратар — гэта вялікая дзірка ў бяздонне.***

— З вулканам, на маю думку, атрымалася цікавая перадгісторыя. У 2009 годзе быў жорсткі крызіс. Мне тады сказалі: «Валера, Гімалаі — гэта, безумоўна, выдатна. Але давай што-небудзь зробім у Расіі». Я пагадзіўся і прапанаваў Камчатку, якая аказалася ідэальнай для палётаў уздоўж схілаў. Запісаў у план і скачок у вулкан Мутноўскі, пра які пасля забыўся. Мая ідэя спадабалася настолькі, што нам вырашылі дапамагчы з верталётамі, сабралася прафесійная каманда. Калі мы ў чарговы раз абмяркоўвалі праект, я паказваў на карце, што «вось тут будуць лыжнікі катацца, а я вазьму ды пралячу над імі», а мне нечакана нагадалі пра вулкан. І тут я зразумеў, што галоўнай «фішкай» праекта становіцца скачок у кратар.

> **«Пляцоўка там вялікая, але калі здарыцца закрутка стропаў, цябе можа знесці ў актыўную частку вулкана, што было б сур'ёзнай праблемай. Аднак усё прайшло добра».**

Праблема ў тым, што Мутноўскі — гэта, па сутнасці, плато вялікай гары. На адной яго палове ўвесь час нешта дыміцца, булькалі гразевыя лужыны, а на другой знаходзіўся «снежны мост», праверыць трываласць якога не было часу. Я быў вымушаны скочыць без папярэдняй праверкі. І тое, што сабой уяўляе гэты снег, было для мяне галоўным пытаннем. Пляцоўка там вялікая, але калі здарыцца закрутка стропаў, цябе можа знесці ў актыўную частку вулкана, што было б сур'ёзнай праблемай. Аднак усё прайшло добра.

***— Дарэчы, калі не памыляюся, вам таксама даводзілася прызямляцца нават у джунглях?***

— У мяне было некалькі праектаў на поўдні Венесуэлы. У басейне ракі Арынока цудоўныя мясціны. Там знаходзяцца сапраўдныя джунглі, сярод якіх на некалькі сотняў метраў узвышаюцца скалы Цепуі. Калі памятаеце, Артур Конан Дойл апісаў іх у сваім навукова-фантастычным рамане «Закінуты свет». Дыназаўраў там, зразумела, няма, аднак у гэтых мясцінах захаваліся арэолы пражывання тых відаў жывёл і раслін, якія больш нідзе не сустракаюцца. У мяне была такая складаная лагістыка, што я не ведаў, як трапіць у патрэбнае месца. Што казаць, дзікі раён на мяжы з Калумбіяй, дзе мясцовыя банды перапраўляюць наркотыкі. Акрамя таго, джунглі аказаліся шмат'ярусныя. І калі ты паглядзіш з зямлі ўверх, наогул не зразумееш, дзе знаходзішся.

***— Вы памятаеце сваю самую працяглую экспедыцыю?***

— Усе скачкі ставіць у адзін шэраг нельга. Аб некаторых можна забыцца на адваротным шляху. Асобна стаяць праекты, на якія ты патраціў шмат высілкаў і часу. Самы працяглы і цяжкі праект для мяне прыпаў на 2004 год. Гэта было ў Пакістане. Мы лезлі па заходняй сцяне гары Амін-Брак, адной з самых цяжкіх сцен у свеце. Яна як тры Астанкінскія тэлевежы: 1,5 тысячы метраў вертыкальнага граніту! Што тут казаць, калі толькі на самой гары мы правялі 2-3 тыдні. І я быў настолькі выматаны, стомлены, што ніяк не мог сабрацца, каб скокнуць. Адметна, што тады якраз быў дзень нараджэння аднаго з маіх сыноў. Я так быў не ўпэўнены ў сабе, што вырашыў перанесці скачок, каб не сапсаваць сыну свята. Дзеля гэтага мне прыйшлося прыдумаць гісторыю пра дрэнны вецер.

### Вышыня пашырае свядомасць

***— Летась вы скокнулі з паўночнай сцяны Эверэста і ўстанавілі рэкорд сярод самых высокіх бэйс-скачкоў. Пасля гэтага англійскія журналісты назвалі вас «рускім смельчаком».***

— Заходнія сродкі масавай інфармацыі часта любяць выкарыстоўваць штампы. Яны мяне могуць назваць і смельчаком, і зламі-галавой. У Расіі мяне так ніхто не называў. Звычайна, калі прыходжу на тэлебачанне, вядучы ў эфіры кажа, што ў нас у гасцях жывая легенда экстрэмальнага спорту».

***— Але з гэтым цяжка не пагадзіцца. Вы зрабілі каля 10 тысяч парашутных скачкоў, і, напэўна, як пілоты самалётаў, інакш пазіраеце на жыццё, бо ведаеце, як наша планета выглядае з вышыні птушынага палёту?***

— Вышыня пашырае свядомасць. Я часта кажу, што на любімыя мясціны варта глядзець з вышыні. Многія з іх выглядаюць адтуль больш прыгожа. А мае любімыя пейзажы — гэта горы. Эверэст — класіка альпінізму.

***— А як жа альпіністы, якія пасля смерці так і застаюцца ляжаць на гары?***

— Праблема вялікіх вышынь заключаецца ў тым, што нават калі чалавек выкарыстоўвае кісларод, добра фізічна падрыхтаваны, ён усё роўна знаходзіцца на мяжы сваіх магчымасцяў. Табе могуць у нечым дапамагчы, падстрахаваць, але ў нікога не будзе сілы несці цябе ўніз. Таму, калі на такой вышыні губляеш магчымасць рухацца самастойна, ты застанешся там нават тады, калі яшчэ жывы. Людзі, якія гінуць на Эверэсце, ляжаць побач са сцежкай.

> **«Гэта было ў Пакістане. Мы лезлі па заходняй сцяне гары Амін-Брак, адной з самых цяжкіх сцен у свеце. Яна як тры Астанкінскія тэлевежы: 1,5 тысячы метраў вертыкальнага граніту!»**

***— Вы сказалі студэнтам, што ваша мара ажыццявіцца тады, калі вы дажывяце да старасці і пабачыце сваіх унукаў...***

— Я тады крыху пажартаваў, а адзін беларускі сайт выдаў матэрыял пад загалоўкам «Мая звышмэта — дажыць да старасці». Безумоўна, я разумею, што ёсць рызыка, небяспека, можа проста не пашанцаваць. Але ёсць горы ў Гімалаях, Альпах, з якіх я хацеў бы скокнуць.

Якія мае бліжэйшыя планы? Па-першае, я чалавек з забабонамі, таму абвяшчаць іх не хачу. А па-другое, хапае канкурэнтаў, якія могуць проста перахапіць ідэю.

***— Як чалавек, які амаль усё жыццё прысвяціў гарам, вы, напэўна, таксама любіце глядзець адпаведнае кіно?***

— Цяпер пра горы пачалі здымаць больш фільмаў. Праўда, яны зняты па галівудскіх шаблонах і перасталі быць праўдзівымі. Я вельмі люблю «Вертыкаль» з Уладзімірам Высоцкім, французскую стужку 1970-х гадоў «Смерць праведніка». Магчыма, яе не ўсе ведаюць, але гэты фільм сапраўды варты таго, каб яго паглядзелі.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
**Фота Надзеі БУЖАН**
**і з архіва Валерыя РОЗАВА.**

### БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ



*Валерый РОЗАЎ — савецкі і расійскі альпініст. Заслужаны майстар спорту па парашутным спорце. Нарадзіўся ў Ніжнім Ноўгарадзе. Альпінізмам пачаў займацца ў 1982 годзе. Здзейсніў больш за 50 узыходжанняў 5-й і 6-й катэгорыі. З 1994-га па 1996 год Розаў удзельнічаў у праекце «Сем вяршынь», у межах якога ўзышоў на Эльбрус (5642 м), Манблан (4810 м), Аканкагуа (6960 м), Кіліманджара (5885 м), пік Піраміда Карстэнз (5040 м). 5 гадоў таму ўпершыню ў гісторыі скокнуў у касцюме-«крыле» ў кратар дзейнага вулкана Мутноўскі. Валерый Розаў зрабіў рэкордны скачок з Эверэста з вышыні 7220 метраў над узроўнем мора.*

**У палёце над Антарктыкай.**



**Касцюм-крыла (альбо вінгсьют) — тканінны касцюм для скачкоў. Складаецца з двухслойных крылаў, якія надзімаюцца праз паветразборнікі набягаючымі патокамі паветра.**



**Любоў да вышыні ў нашага героя з дзяцінства.**



**У альпіністаў усё раскладзена па «палічках».**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 12 2014 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Борисовбытсервис» (продавец)
проводит открытый аукцион по продаже имущества:**

**ЛОТ № 1: комплексный приемный пункт** общ. пл. **59,6 кв.м**, инв. № 610/С-54702, на земельном участке пл. **0,0113 га** (предоставлен на праве аренды) в Борисовском районе, д. Большое Стахово, ул. Чуры, д. 2А. Недвижимое имущество обременено договором аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 53 875 280 бел. руб.**

**ЛОТ № 2: комплексный приемный пункт** общ. пл. **50,9 кв.м**, инв. № 610/С-54701, на земельном участке пл. **0,0089 га** (предоставлен на праве аренды) в Борисовском районе, д. Корсаковичи, ул. Центральная, д. 1.

**Начальная цена с НДС – 36 952 880 бел. руб.**

**ЛОТ № 3: здание склада,** общ. пл. **89,0 кв.м,** инв. № 610/С-43891, на земельном участке пл.**0,0232 га** в Борисовском районе, г. Борисов, ул. Гончарная, д. 24а.

**Начальная цена с НДС – 17 573 доллара США.**

**ЛОТ № 4: комплексный приемный пункт,** общ. пл. **55,7 кв.м,** инв. № 610/С-55652, на земельном участке площадью **0,0100 га** в Борисовском районе, Зачистинском с/с, д. Кострица, ул. Полоцкая, д. 42А.

**Начальная цена с НДС – 4 451 доллар США.**

**Задатки в размере 10% от начальной цены объекта (лота) перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Стоимость предмета торгов, установленную в долларах США, победитель торгов оплачивает в белорусских рублях по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.01.2015** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.01.2015** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Солигорский райагросервис» (продавец)
проводит открытый аукцион
по продаже одним лотом имущества в составе:**

- **здание АБК** (инв. № 644/С-896) общ. пл. **636 ,7 кв.м;**
- **цех сборки с/х машин** (инв. № 644/ С-37989) общ. пл. **798 кв.м;**
- **здание проходной** (инв. № 644/ С-52678) общ. пл. **33.2 кв.м;**
- **здание весовой** (инв. № 644/С -52677) общ. пл. **41.8 кв.м;**
- **трансформаторная станция с воздушной и кабельной линиями** (инв. № 644/С-52750);
- **канализационная станция и канализационные сети** (инв. № 644/С -52754);
- **противопожарная насосная станция с пожарным резервуаром для воды** (инв. № 644/С -52752);
- **площадка для хранения с/х машин** (инв. № 644/С -52753);
- **производственная площадка** (инв. № 644/С -52757);
- **дороги** (инв. № 644/С-52758);
- **водопровод** (инв. № 644/С -52775);
- **забор железобетонный** (инв. № 644/С -52774);
- **оборудование:** котел отопительный, бойлер, кран-балка (3) **по адресу: Минская область, Солигорский район, Чижевичский с/с, 43, Любанское шоссе.**

Недвижимое имущество обременено договорами аренды (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

**Начальная цена с НДС – 11 428 585 200 бел. руб.**

**Задаток 5% от начальной цены (571 429 260 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.01.2015** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.01.2015** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ОАО «Солигорскторг» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион
по продаже недвижимого имущества в составе:**

ЛОТ № 1: одноэтажное кирпичное **здание склада** продовольственных товаров № 1, общ. пл. 1 604,9 кв.м (инв. № 644/С-34916), зеленые насаждения (береза, 5 шт.), расположенное на земельном участке площадью 0,5314 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1. Начальная цена с НДС – **1 584 558 000** бел. руб. *(стоимость снижена на 20%)*. Задаток 10% от начальной цены (158 455 800 бел. руб.).

ЛОТ № 2: одноэтажное кирпичное **здание мебельного склада**, общ. пл. 972,9 кв.м (инв. № 644/С-34933), зеленые насаждения (береза, 2 шт.), расположенное на земельном участке площадью 0,3498 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1. Начальная цена с НДС – **550 848 720** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (55 084 872 бел. руб.).

ЛОТ № 3: **подъездной путь к железной дороге**, протяженностью 405,7 м (инв. № 644/С-50473), расположенный на земельном участке площадью 0,5635 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1. Начальная цена с НДС – **243 331 200** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (24 333 120 бел. руб.).

ЛОТ № 4: **здание склада № 6,9** общей площадью 1 724,9 кв.м (инв. № 644/С-2073), расположенное на земельном участке общей площадью 0,3752 га по адресу: Минская область, Солигорский район, район ст. Калий-1. Начальная цена с НДС – **3 006 796 800** бел. руб. *(стоимость снижена на 20%)*. Задаток 10% от начальной цены (300 679 680 бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.10.2014.*

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **29.12.2014 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.12.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению Республиканского унитарного предприятия «Управляющая компания холдинга «Белавтодор» (продавец)**

**проводит повторный открытый аукцион по продаже легкового автомобиля VAZ - 21104-01**

**(2005 г.в., г/н 9045 НК-7, кузов № ХТА21104050859113). Транспортное средство находится в г.Минск, ул. Кальварийская, 37.**

**Начальная цена с НДС – 9 144 000 бел. руб.
Цена снижена на 50%.**

**Задаток в размере 10% (914 400 бел. руб.) от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.12.2014.*

Аукцион состоится **29.12.2014 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.12.2014** до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

**ОАО «Світанак» г. Жодино**

**ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ
ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ**

**по разработке строительного проекта с выделением очередей, на основании ранее разработанного архитектурного проекта:**
«Реконструкция сооружений водоподготовки и очистки сточных вод ОАО «Світанак» по ул. 8 Марта, 1 в г. Жодино. Корректировка».

Конкурсные предложения принимаются по адресу:
**г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 14.00 12.01.2015 г.**
За дополнительной информацией обращаться по тел.:
**8 (01775) 3-36-29, 7-01-86, 7-16-44.**
УНП 600038919

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства «Жилая многоквартирная застройка со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого в г. Минске. 3-я очередь строительства. Жилой дом № 7 по генплану»)

**Информация о застройщике**: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник–четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30–16.15, обед – 12.45–13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко, фактический срок строительства – 16 месяцев.
2. Жилой дом № 26 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
3. Жилой дом № 22 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 10 месяцев.
4. Жилой дом № 1 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
5. Жилой дом № 3 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 13 месяцев.
6. Жилой дом № 5 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 10 месяцев.
7. Жилой дом № 28 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 13 месяцев.
8. Жилой дом № 7 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.
9. Жилой дом № 9 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 8 месяцев.
10. Жилой дом № 32 по ул. М.Горецкого, фактический срок строительства – 11 месяцев.
11. Жилой дом № 11 по ул. Прушинских, фактический срок строительства – 7 месяцев.

**Информация о проекте и об объекте строительства:**

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе с привлечением к строительству не менее 10% общей площади жилых помещений граждан, из числа многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска.

Положительное заключение государственной экспертизы № 1035-15/13 от 30.12.2013 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Фрунзенский район, жилой дом № 7 по генплану в жилой многоквартирной застройке со спортивным комплексом (спортивный зал, административно-бытовые помещения) и многоэтажным гаражом-стоянкой в границах улиц Шаранговича, Горецкого. 3-я очередь строительства.

**Характеристика объекта.**

Объект – 119-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-464-У1М с помещением товарищества собственников на первом этаже. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды), без электрической плиты.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели. Перекрытия – железобетонные. Отопление – центральное. Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Стоимость 1 м$^2$ общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий:

**2-комнатные квартиры – 14 500 000 руб.**
**3-комнатные квартиры – 13 800 000 руб.**

**Условия оплаты: поэтапная.**

Застройщик вправе изменить цену объекта долевого строительства (цену договора) в случаях изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ в нормативный период строительства жилого дома, а также в случае отсутствия вины застройщика в невыполнении срока исполнения застройщиком обязательств по договору при наличии подтвержденных решением местного исполнительного и распорядительного органа форс-мажорных обстоятельств и других, не зависящих от застройщика причин. При этом застройщик при достройке объекта вправе применять индексацию стоимости выполняемых работ в течение всего дополнительного срока строительства. Изменение цены объекта долевого строительства также возможно в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, если они оказали влияние на цену объекта долевого строительства.

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г., свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 29 декабря 2012 г. № 500/1001-1788. Площадь земельного участка – 4,1803 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 119.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Начало строительства жилого дома – 3-й квартал 2014 г., предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – 2-й квартал 2015 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 3531 от 22 ноября 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагается 30 квартир, из них 18 двухкомнатных общей площадью 67,67 м$^2$, жилой площадью 34,83 м$^2$; 8 трехкомнатных квартир общей площадью 83,8 м$^2$, жилой площадью 48,18 м$^2$; 4 трехкомнатные квартиры общей площадью 82,67 м$^2$, жилой площадью 47,21 м$^2$.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**

Прием заявлений от граждан осуществляется отделом собственного строительства и инвестиций ОАО «МАПИД» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205а, кабинет № 1, тел. 207 19 15) с 29 декабря 2014 г., ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, понедельник–четверг с 9.00 до 17.00, обед с 12.45 до 13.30, в пятницу с 9.00 до 15.00, обед с 12.45 до 13.30.

Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных квартир.

Если гражданин, желающий принять участие в долевом строительстве, в течение пяти календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и ОАО «МАПИД» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим гражданином.

Ознакомиться с планировками квартир можно на сайте ОАО «МАПИД» **www.mapid.by.**

Ход канём

# ШАХ І МАТ АД ЛАНІТЫ,

## або Шахматыстка, не падобная да іншых

**Фігуры, якія лятаюць, талісманы ў выглядзе цацак і махляры за сталом у клетку... Ланіта СЦЯЦКО, шматразовы прызёр першынства краіны па шахматах, член нацыянальнай зборнай, распавяла пра сваё галоўнае захапленне і правяла для нашых чытачоў займальную экскурсію па шахматным закуліссі.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### УЗРОСТ — НЕ ГАЛОЎНАЕ

— Першы мат я паставіла свайму дзядулю. Менавіта ён і стаў маім першым сапернікам. У дзяцінстве мне спадабалася спаборнічаць і перамагаць менавіта хлопчыкаў. А зараз у агульным рэйтынгу я нават абыходжу тых, хто па ўзросце набліжаецца да маіх бацькоў. І я заўважыла, што многія дарослыя моцна засмучаюцца, калі ўступаюць мне. Пры гэтым яны ведаюць, што я добра гуляю, але ўсё роўна эмацыянальна ўспрымаюць паражэнне. Нядаўна ў Мінску праходзіў нацыянальны спартыўны фестываль «Мова Кап». І да мяне на сеанс адначасовай гульні прыйшоў мужчына-аматар, які хацеў згуляць выключна са мной. Як высветлілася, яму проста было цікава, ці здолею я яго перайграць.

У дзяцінстве даволі шмат даводзілася сутыкацца з негатыўнай рэакцыяй у дачыненні да шахмат. У маіх аднакласнікаў на гэты конт быў свой погляд. Мне казалі, што я не падобная да шахматыстаў. І пакуль не прынесла ў школу свае медалі і фотаздымкі, мне ніхто не верыў. У дзяцінстве я яшчэ займалася фігурным катаннем. Праўда, лепшыя вынікі ў мяне былі менавіта ў шахматах, а таму і вырашыла сканцэнтравацца на гэтым відзе спорту.

Спартыўны дух у мяне заўжды быў на належным узроўні. І мне час ад часу бывае вельмі крыўдна за паражэнні. У дзяцінстве шмат плакала. Маці пастаянна супакойвала, але я часам ні з кім не размаўляла, зачынялася ў сваім пакоі. У мяне былі два выпадкі, калі на чэмпіянаце Беларусі сярод дзяўчат я ішла на першым месцы з даволі значным адрывам, але ў выніку двойчы ўступала сваёй саперніцы. Норму жаночага гросмайстра я выканала, засталося толькі павысіць свой рэйтынг і тады ўжо можна будзе афармляць дакументы для атрымання вышэйшага шахматнага звання.

### ЦІ МОЖНА ГЭТЫМ ЗАРАБІЦЬ НА ЖЫЦЦЁ?

— Кожны год удзельнічаю ў пяцішасці міжнародных спаборніцтвах. Я вочна вучуся ў Інстытуце бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ, і выкладчыкі, безумоўна, ведаюць пра мае ад'езды. У спартсменаў-студэнтаў нават ёсць індывідуальны план, згодна з якім яны з-за спаборніцтваў і трэніровак могуць прапусціць пэўную колькасць заняткаў. «Хвастоў» раней не было, а на апошніх курсах, калі пачала больш актыўна спаборнічаць, яны, на жаль, з'явіліся. Праўда, калі выкладчыкі даведваюцца, што я шахматыст, ставяцца да мяне інакш, чым да тых жа футбалістаў. Напэўна, думаюць, што калі дзяўчына гуляе ў шахматы, значыць, нешта разумее.

**«Я заўважыла, што многія дарослыя моцна засмучаюцца, калі ўступаюць мне. Пры гэтым яны ведаюць, што я добра гуляю, але ўсё роўна эмацыянальна ўспрымаюць паражэнне».**

Што да фінансаў, раней часта прыходзілася на міжнародныя спаборніцтвы ездзіць за сямейныя грошы, цяпер усё аплачвае Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках. Заробак ад Міністэрства спорту і турызму ў нас атрымліваюць толькі члены нацыянальнай зборнай, але ў Беларусі ёсць шахматысты, якія зарабляюць на жыццё выключна спортам. Пры гэтым праблем з фінансаваннем хапае, бо шахматы не ўваходзяць у алімпійскую праграму. Многія дзяўчаты заканчваюць шахматную кар'еру, калі нараджаюць дзяцей. Я яшчэ планую пагуляць некалькі гадоў, а пасля збіраюся паспрабаваць сябе ў іншай сферы.

### ВЫЙГРАЎ — АТРЫМАЙ ФЕРЗЕМ У ЛОБ

— Паміж намі ходзіць такі жарт: калі заснеш за сталом, то павалішся і вока фігурай праб'еш. Аднойчы я бачыла, як чалавек прайграў і пачаў саперніка закідваць фігурамі, спрабаваў біць яго дошкай... Дарэчы, дыскваліфікаваць могуць не толькі за паводзіны, але і за наяўнасць у цябе мабільнага тэлефона. Тлумачыцца гэта тым, што праз яго табе могуць падказаць шахматныя хады. Нядаўна выйшлі новыя правілы, якія забараняюць праносіць тэлефоны нават у гульнявую зону. Іх абавязкова трэба здаваць суддзям. Махляры сярод шахматыстаў таксама сустракаюцца. І далёка не заўсёды атрымліваецца даказаць іх віну.

### ЛЕПШЫ СТЫМУЛ ДЛЯ ПЕРАМОГІ — ФУТБОЛ

— Шахматысты таксама маюць свае забабоны. Нехта з сабой заўжды носіць ручку для запісаў ходаў, у якой ужо скончылася чарніла, або апранае на спаборніцтвы аднолькавыя кашулі, не голіца, ставіць каля сябе цацку-талісман, слухае перад партыямі музыку, чытае кніжкі. Ці веру ў шахматныя сны? Ды я ў сне вырашыла сапраўдную задачу! Мы неяк на зборах ніяк не маглі справіцца з адным практыкаваннем. Дык прыйшлося рашаць яго менавіта ў сне. Але гэта ўсё з-за нервовага напружання. Падчас турніраў мне заўжды сніцца нешта падобнае.

Мая самая цяжкая гульня працягвалася пяць з паловай гадзін. І падобныя партыі — не рэдкасць. Зразумела, падчас гульні я магу стаць, прагульвацца, але на шостай гадзіне галава проста перастае працаваць. Часам сапраўды пачынаеш думаць аб тым, што хочацца спаць, есці, а дома чакае смачная вячэра. Прыходзіцца хутка прыводзіць сябе ў тонус. Аднойчы хацела хутчэй скончыць партыю, каб паспець убачыць футбольны матч паміж «Барселонай» і маім любімым мадрыдскім «Рэалам». Бачыла, што павінна перамагаць, але сапернік змагаўся да апошняга. А я сядзела і думала: «Божа, ды калі ты ўжо здасіся?! Мне яшчэ на трансляцыю паспець трэба!». У выніку прыехала ў гасцініцу перад самым пачаткам матча. Дарэчы, «Рэал» тады таксама перамог.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**Выбіралі паміж Машай і Ланітай**

**— Імя мне прыдумала маці. Праўда, яна спачатку хацела назваць мяне Машай, але бацька адмовіўся. Вось тады ўсе і спыніліся на Ланіце, выбралі скарочана варыянт Лана. Што яно азначае? Ланіты — гэта шчокі па-стараруску. Раней гэтага таксама не ведала, аднак пасля пачала заўважаць, што слова даволі актыўна ўжываецца ў літаратуры.**

# «Набіць мячыкам» чэмпіёнства

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— А раскажы, як склаўся ваш тандэм са славачкай Тэрэзай Міхалікавай?***

— Дагэтуль разам у пары не выступалі. Але мы знаёмы з трынаццаці гадоў, сябруем. І так атрымалася, што неўзабаве перад US Open, на турніры ў Берліне, спытала ў яе: «Згуляем "пару"?» Тэрэза пагадзілася. На корце мы сапраўды атрымлівалі асалоду, а да выніку ставіліся з лёгкай іроніяй. Напэўна, гэтая лёгкасць і дапамагла нам дайсці да фіналу, хаця мы былі далёкія ад статусу фаварытаў. Цяпер вось рыхтуемся згуляць разам і на Australian Open. Раптам гісторыя паўторыцца?

***— Акрамя добрага выступлення на турніры, чым яшчэ запомніўся Нью-Ёрк?***

— Вельмі ўразіла плошча «Тайм-сквер». Там неверагодна прыгожа! Пасля парнага фіналу мы адправіліся туды развітацца з горадам. А яшчэ добра памятаю, як хацела хутчэй выйграць апошні кваліфікацыйны матч, каб атрымаць акрэдытацыю, якая дазволіла б знаходзіцца ва ўсіх зонах тэніснага цэнтра. Выйграла — і тут пачалося раздолле! У адно імгненне тэнісныя «зоркі» сталі дасягальнымі. Так дзіўна было ў сталовай стаяць у адной чарзе з Анай Іванавіч ці Каралін Вазняцкі. Ды і проста пабачыць «жывых легенд» — Роджэра Федэрэра, Серэну Уільямс, Новака Джокавіча — дарагога каштуе.

***— І з адной такой «зоркай» ты нават сфатаграфавалася, хаця юніёрам гэта забаронена...***

— А яшчэ нам не дазваляюць праходзіць на трыбуны цэнтральных кортаў, але я ўсё роўна прабіралася паглядзець матчы прафесіяналаў *(смяецца)*. Што тычыцца здымка, то сапраўды ў мяне ёсць фота з трыумфатарам сёлетняга US Open Марынам Чылічам (харвацкі тэнісіст, 9-я ракетка свету. — **Аўт.**). Назірала за матчам Іры, а на суседнім корце трэніраваўся Чыліч. Пасля трэніроўкі падышла да яго, папрасіла сфатаграфавацца. Пагадзіўся без праблем. Яшчэ і пацікавіўся, адкуль я і якіх поспехаў ужо дабілася «на юніёрах», пажадаў нам з Тэрэзай поспехаў у пары. Гэта, здаецца, было перад яго чвэрцьфінальным матчам. А пасля ён абыграў Федэрэра і ў выніку сенсацыйна выйграў турнір.

***— Як так здарылася, што прыходу ў тэніс ты абавязана фігурнаму катанню?***

— Ім я пачала займацца ў чатыры гады. Але праз два гады трэнеры сказалі бацькам, што гэты від спорту не для мяне: занадта высокая для «фігуркі». У дзяцінстве я сапраўды вельмі хутка расла, за год магла «дабавіць» 8-10 сантыметраў! Сышла, хаця было крыўдна, бо я лічылася перспектыўнай: вытрымлівала сур'ёзныя нагрузкі, была старанная, гнуткай... У той час мой старэйшы брат займаўся тэнісам. Каб чымсьці заняць сябе, стала хадзіць да брата на трэніроўкі. А пакуль яго чакала, «набівала» мячыкам па сцэны. Так і пачаўся мой «раман» з тэнісам.

***— А ў брата як спартыўная кар'ера склалася?***

— Да пэўнага моманту ўсё было нядрэнна, на роўных канкурыраваў з лепшымі спартсменамі свайго ўзросту. А пасля, напэўна, змяніліся прыярытэты. Зараз ён увесь у нейкіх праектах, бізнесе, ракетку даўно не браў у рукі. Але час ад часу жартуе: «Вось пачну трэніравацца, і тады табе не паздаровіцца». А я ўсё чакаю, пакуль ён будзе гатовы мяне паспарынгаваць *(смяецца)*.

***— Ты вучышся ў дзявятым класе. Хутка трэба будзе вызначацца з паступленнем. Якія варыянты разглядаеш?***

— Калі і далей буду дэманстраваць годныя спартыўныя вынікі, па традыцыі, пайду ў БДУФК. Калі спынюся ў развіцці ці раптам здарыцца нейкая траўма, тады буду думаць. У школе мне падабаюцца многія прадметы — ад літаратуры і гісторыі да матэматыкі і хіміі. Люблю пісаць сачыненні, магу хоць дзесяць варыянтаў за раз «настрачыць»! Адзіная навука, якая мне цяжка даецца, — гэта фізіка. Асабліва тады, калі з-за спаборніцтваў прапускаю якую-небудзь тэму. Пасля наганяю ў такіх пакутах!.. Хаця гэта для мяне нехарактэрна: звычайна ўсё атрымліваецца вельмі лёгка — за што ні вазьмуся. Але заўжды ёсць выключэнні.

***— Раскажы пра свой звычайны графік на тыдзень?***

— У мяне толькі адзін выхадны — нядзеля. У астатнія дні па тры трэніроўкі — напрыклад, дзве тэнісныя і адна па фітнесе. Некалькі разоў на тыдзень яшчэ крос, басейн ці саўна. Звычайна трэніровачны дзень заканчваецца гадзін у пяць вечара.

**«У мяне толькі адзін выхадны — нядзеля. У астатнія дні па тры трэніроўкі — напрыклад, дзве тэнісныя і адна па фітнесе. Некалькі разоў на тыдзень яшчэ крос, басейн ці саўна. Звычайна трэніровачны дзень заканчваецца гадзін у пяць вечара».**


Фота Надзеі БУЖАН.

***— У школе, зразумела, самастойнае навучанне. А на падлеткавыя радасці — сустрэчы з сябрамі, кіно, кнігі — час застаецца?***

— Калі заканчваюцца трэніроўкі, магу сустрэцца з сябрамі. Ды і на фільмы-серыялы часу, насамрэч, таксама хапае. Нядаўна, дарэчы, пачала глядзець «Маладзёжку» — расійскі серыял пра хакеістаў. Пакуль падабаецца *(усміхаецца)*. А вось чытаць неяк кінула. Але ўжо сама сабе паабяцала, што вярнуся да кніг. Бо часам бывае: чуеш словы і не разумееш, як яно пішацца. Уласны «слоўнік» трэба папаўняць пастаянна!

***— Многія спартсмены карыстаюцца доўгімі пералётамі і чытаюць у дарозе...***

— У самалётах я звычайна займаюся іншымі справамі. Часцей за ўсё проста адпачываю ці сплю. Часам праглядаю на тэлефоне старыя фоткі ці манцірую відэаролікі. Амаль што на кожных спаборніцтвах я нешта здымаю, шмат фатаграфую, а пасля раблю невялічкія ролікі. Як кажуць, для сябе, на памяць.

***— Дык, можа, варта задумацца пра рэжысёрскую адукацыю?***

— Не ўпэўнена, што мне зараз гэта патрэбна. Аднак як варыянт на будучае — магчыма. Прынамсі, гэта вельмі цікавы занятак. Але пакуль усе мае думкі толькі пра тэніс.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

SEX-БАЛЯСЫ

# АГАЛЯЮЦЦА ЎСЕ!

**Напрыканцы года заведзена падводзіць яго своеасаблівыя вынікі: што было, што радавала або засмучала, чаго не адбылося ў жыцці. Не будзем адступаць ад гэтага няпісанага правіла і мы. Ну, пагадзіцеся, не заслужыў «эратычны фронт» таго, каб пра яго замоўчвалі! Ды і хіба ж гэта сапраўднае жыццё, калі ў ім няма самі ведаеце чаго?! Дык вось, як чалавеку, які мае з той прычыны не толькі задавальненне, але і кавалак хлеба (у сэнсе, піша на азначаную тэму), і таму павінен адсочваць самыя яскравыя тэндэнцыі, кінулася ў вочы наступнае. Калі перафразіраваць словы аднаго з герояў камедыі «Іван Васільевіч мяняе прафесію»: агаляюцца ўсе! У тым сэнсе, што за апошні адносна невялікі прамежак часу «градус» выстаўленай напаказ галізны імкліва «зашкаліў». Куды ні глянь, усюды — цела. Яшчэ нядаўна пачэсна было быць нябачным байцом «эратычнага фронту», а зараз...**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Не, з кіно ўсё зразумела. Гэта мастацтва, прыгажосць... рэйтынгі. Ніхто не заўважыў, напрыклад, як у адміністратара рэстарана Вікторыі Сяргееўны з серыяла «Кухня» з ростам яго папулярнасці спадніцы і сукенкі станавіліся ўсё больш адкрытымі? А што, актрыса прыгожая, ножкі — таксама... Як тут не прыгадаць у тэму эпізод праследавання «МУРаўцамі» «Студэбекера», на якім спрабаваў уцячы Фокс, з савецкай стужкі «Месца сустрэчы змяніць нельга». Памятаеце, Глеб Жаглоў высоўваецца з наганам з акна аўтобуса і крычыць супрацоўніку, каб той трымаў яго за ногі? «Ваня, Пасюк, трымай мяне!» — «Як трымаць, Глеб Ягоравіч?» — «Пяшчотна!» Ну дык і Вікторыю Сяргееўну многія, напэўна, хацелі б гэтак жа патрымаць... Прыгажосць — прыгажосцю, але перабор з натурай на экране заўважылі і КВЗшнікі. Адна з каманд пажартавала пра Дзмітрыя Нагіева, калі той сядзеў у журы ў сексуальнай майцы пад пінжаком, назваўшы яго «мужчынам з дэкальтэ». А гэтыя хлопцы, як вы ведаеце, жартаваць умеюць — сказана як звязана.

**У праекта ёсць афіцыйны дэвіз: «Дзе розум не працуе, у грудзей ёсць шанц».**

Мы раней пісалі пра «моду» ў дзяўчат здымацца аголенымі недзе ў людных, грамадскіх месцах. Гэткая аперацыя «шок і дрыжыкі». Пра эратычныя календары таксама гаварыць, мабыць, не варта: «перахварэлі» ўсе, хто хацеў. Пры сучасных тэхналогіях гэта — дзіцячая забаўка. Відэа ў інтэрнэт — вось гэта па-нашаму! Памятаеце пра навагодні карпаратыў і Любу — зорку YouTuba ў Сямёна Слепакова? «Расплескало Любу по ночному клубу, разбросало Любу да по стульям и столам. А под песню Лепса на колени влезла к шефу и очки с него сняла...» Там яшчэ шмат чаго было, але галоўнае ў іншым. «Но не знала Люба, что подруга Люда праздник весь сняла на телефон...» Падставілі Любу, якая аказалася пасля гэтай гісторыі «за палярным кругам». А вось з «зорак» Галівуда, у якіх адносна нядаўна хакеры выцягнулі з архіваў і выклалі ў адкрыты доступ іх эратычныя (і не толькі) здымкі, наколькі я ведаю, туды ніхто не падаўся. Паабураліся крыху для выгляду і прыціхлі. Мабыць, зараз яшчэ і ганарацца сабой.

«Трэнд» апошняга часу — рознага кшталту сэлфі. Ведаеце анекдот, чым адрозніваюцца фотаальбомы бабуль і іх унучак? У першых: 1946 год — пайшла ў школу (1 фота), 1956 — скончыла школу (2 фота), 1961 — скончыла ўніверсітэт (1 фота), 1964 год — выйшла замуж (3 фота). У другіх: 19.38 — прыйшла ў кавярню (29 фота), 19.41 — прынеслі меню (18 фота), 19.52 — прынеслі заказ (41 фота), 19.59 — пайшла ў прыбіральню (123 фота), 20.03 — выходзячы з яе, сустрэла сяброўку (52 фота), 20.11 — прынеслі дэсерт (28 фота), 20.25 — прынеслі рахунак (12 фота). Прычым зняць самога сябе нават з эратычным падтэкстам ужо недастаткова. Таму, напрыклад, настаўніца музыкі робіць пікантныя фатаграфіі не дома, а на рабочым месцы — у класе, з якога, магчыма, толькі што выйшлі яе вучні. Ці дзяўчаты кідаюць выклік адна адной і перадаюць эстафету знішча ў вобразе... страказы. Ведаеце, як гэта робіцца? Трэба агаліцца, а станік нацягнуць сабе на галаву. Яго «чашачкі» быццам імітуюць вочы насякомага. Фатаграфію выкласці ў сецівa і спытаць у некалькіх сяброваk ці знаёмых: «А вам так «слабо»?..»

І вось апошняя па часе навіна ў тэму. Адна італьянка стварыла ў сеціве рэсурс пад назвай «Грудзі за навуку» (так і хочацца ўслед за адным з персанажаў са стужкі «Брат» гэтак жа пракрычаць: «Свабоду Анжэле Дэвіс!»). Сутнасць у наступным. Жанчыны могуць публікаваць на ім свае фатаграфіі ў споднім бялізне ці ўвогуле без яе. Аднак пры гэтым здымак абавязкова павінен суправаджацца таблічкай, дзе караценька паведамляецца пра які-небудзь навуковы факт («Старасць — гэта калі ўсё менш студэнтак выбіраюць цябе сваім навуковым кіраўніком»). У канцы публікацыі размяшчаецца спасылка, па якой можна атрымаць больш падрабязную інфармацыю па закранутай навуковай тэме («Сёма, што вы маеце сказаць за старасць?» — «Старасць — гэта калі з інтымных органаў засталіся толькі вочы. Але позірк — цвёрды!»). У праекта ёсць афіцыйны дэвіз: «Дзе розум не працуе, у грудзей ёсць шанц». Стваральніца рэсурсу тлумачыць сваю незвычайную ініцыятыву так: удзельніцы спрабуюць данесці да грамадства сутнасць шэрагу навуковых адкрыццяў, узмацніць цікавасць да навукі ў цэлым. («Нядаўнія даследаванні выявілі, што жанчыны, якія маюць лішнюю вагу, жывуць даўжэй, чым мужчыны, якія звярнулі на гэта ўвагу»). Дарэчы, сцвярджаецца, што ў апошні час мужчыны таксама сталі публікаваць свае фатаграфіі на сайце («Гэта толькі ў казках цябе любяць за багаты характар. А ў жыцці — за боршч, карункавую бялізну і маўчанне»). Што ж, яшчэ адзін спосаб паразумецца. Прынамсі, адкрыты. У любым сэнсе гэтага слова...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «З ДУМКАЙ, ШТО ТЫ — БЕЗДАР, ТРЭБА ПЕРАСПАЦЬ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— А наогул змагацца з самім сабой у штодзённым жыцці часта даводзіцца?***

— Што датычыцца музыкі, то ў мяне не бывае такога, каб ленаваўся, напрыклад, ісці на рэпетыцыю. Бо музыка — гэта ўсё маё жыццё. Дзякуючы ёй я маю магчымасць карміць сям'ю. Часам кладзешся спаць з думкай, што ты бездар, а раніцай прачынаешся і робіш новыя крокі. Творчыя людзі складаныя. Я, напрыклад, магу цэлы дзень быць не ў гуморы, часам нават прыкрыкну на жонку альбо на сына, а потым адпускае — і прашу прабачэння...

***— Падтрымка родных дапамагае табе ў творчасці?***

— Мне наогул вельмі прыемна адчуваць падтрымку іншых, асабліва з боку старонніх людзей. У тым жа інтэрнэце шмат пішуць. Але самае галоўнае для мяне — меркаванне сям'і. Сваіх родных я заўсёды прашу выказвацца адкрыта. І мая жонка не стане маўчаць, калі нешта будзе не так. Менавіта яе крытыкай і меркаваннямі я найбольш даражу.

***— Часта са з'яўленнем новага артыста яго біяграфія пачынае абрастаць рознымі чуткамі. Ты ўжо з гэтым сутыкнуўся?***



— Пісалі неяк, што ў мяне ёсць нявеста, хаця я жанаты чалавек. І сына назвалі Яўгенам, а майго завуць Іван. Наогул той факт, што стаў адчуваць да сябе больш увагі, успрымаю адэкватна. Ніякай «зоркі» не злавіў. Разумею, я не застрахаваны ад таго, што нехта будзе ставіць мне «палкі ў колы». І не захочa дзяліцца са мной сваім месцам на сцэне. Я гэтага абсалютна не баюся, бо вырашаць, хто годны быць на сцэне, павінны слухачы...

**«Калі з'яўляецца дзіця, то хочаш альбо не, але ты пасталееш і будзеш ужо зусім па-іншаму сябе паводзіць. Я з'яўляюся прыкладам для сына, таму павінен сачыць, што раблю і як гавару. Але быць бацькам класна».**

***— Як дэманстраваў свой талент у дзяцінстве?***

— У мяне бацькі звязаны з мастацтвам: тата — гукарэжысёр і спявае, а маці раней працавала рэжысёрам у тэатры. Добра памятаю свой першы выхад на сцэну. Мне было гады чатыры. На адным з канцэртаў, дзе выступаў мой бацька, быў і я з ім. Я Рыгор Рыгоравіч, таму, пачуўшы, як аб'явілі, што «цяпер на сцэну выходзіць Рыгор Лавыш», выбег туды з мікрафонам.



***— А потым, мабыць, класічны сцэнарый: музычная школа, каледж...***

— У музычнай школе я правучыўся толькі год. Наогул хацеў іграць на гітары, а паколькі на гэты інструмент не набіралі, то мяне на фартэпіяна «запісалі». Вытрымаў толькі год навучання. Сябры гулялі ў футбол пасля ўрокаў, а для мяне існавалі толькі заняткі ў школе, «музыкалка» і хатнія заданні. Такі расклад мяне хутка стаміў, і я папрасіў у мамы на дзень нараджэння пакінуць навучанне. Зараз вельмі шкадую пра тое рашэнне, бо не зрабі тады я такі крок, сёння рухаўся б значна хутчэй. Цяпер шчыльна займаюся самаанавучаннем.

***— У выбары музыкі якім стылям і выканаўцам аддаеш перавагу?***

— У дзяцінстве тата слухаў гурты ABBA і QUEEN — увогуле, якая была сумесь! Калі я падрос, то пэўны час захапляўся рэпам. А затым густы змяніліся, і я пачаў цікавіцца рокам. Дарэчы, і сёння застаюся фанатам гэтага кірунку ў музыцы, хоць ужо і не нашу доўгія валасы і апранаюся зусім па-іншаму. Для мяне рок стаіць на адным узроўні з класікай, бо таксама дае багатую прастору для творчасці. Калі выбіраю кампазіцыі для ўласнага выканання, то імкнуся не капіраваць артыста, а прыўносіць сваё бачанне і эмоцыі. Хачу выпрацаваць свой стыль.

***— Знешне ты зусім па-іншаму выглядаеш, але неяк абмовіўся, што ў душы застаешся вялікім дзіцем...***

— Калі ў вольную хвілінку саджуся за відэагульні, то сам гэта адчуваю. Бывае, нават з сынам спрачаемся, хто будзе сядзець за камп'ютарам. Але толькі так мне ўдаецца адключыць мозг ад думак пра музыку, а часам гэта вельмі патрэбна. Інакш можна проста звар'яцець. Гульні мяне ратуюць. Я сыходжу ў іншы свет, а калі вяртаюся, то зноў гатовы брацца за творчасць з новымі сіламі.

***— Як чалавек творчы, мабыць, і будучую жонку заваёўваў прыгожа?***

— Сімпатыя ў нас была ўзаемнай. Як кажуць, каханне з першага позірку. Цяпер я веру, што яно бывае. Мы працавалі побач: я падпрацоўваў музыкантам, а яна — афіцыянткай. Нейкі час прыглядаліся і маўчалі, а потым пачалі сябраваць. І ў адной з размоў жартам заварылі пра тое, што вось можна і жаніцца. Але я сказаў: «Не буду рабіць прапанову, хіба што сама адважышся». І Насця зрабіла гэта ў SMS-паведамленні. Я пагадзіўся.

***— Без усялякіх сумненняў? Маўляў, рана яшчэ...***

— Мне быў 21 год, я вучыўся ў каледжы на трэцім курсе. А праз год нарадзіўся сын Іван. Тады быў напружаны перыяд, бо днём я вучыўся, ноччу працаваў, а трэба было яшчэ і жонцы з сынам дапамагчы, і да дзяржаўных іспытаў рыхтавацца... Калі з'яўляецца дзіця, то хочаш альбо не, але ты пасталееш і будзеш ужо зусім па-іншаму сябе паводзіць. Я з'яўляюся прыкладам для сына, таму павінен сачыць, што раблю і як гавару. Але быць бацькам класна.

***— Жонка не скардзіцца, што ты ў пастаянных раз'ездах, паглыблены ў творчасць?***

— Здараюцца непаразуменні, але гэта нармальна і сведчыць пра тое, што яна неабыякава ставіцца да маёй працы. Калі б Насця маўчала, то варта было б непакоіцца. Яна разумее: так трэба, гэта мой выбар. Ведала ж за каго замуж выходзіла.

***— Жыццё артыста цябе самога ўсім задавальняе?***

— У любой прафесіі ёсць свае нюансы, і да іх трэба прывыкаць. Мне на пачатку было складана прызвычаіцца да пастаянных раз'ездаў. Часам здараецца, што вяртаешся з адной паездкі, начуеш дома і зноў збіраешся ў дарогу... У працы здараюцца розныя сітуацыі, але творчасць не можа надакучыць, бо дае табе ўнікальную магчымасць шукаць сябе на сцэне...

**Алена ДРАПКО.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета addрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.010.
Нумар падпісаны ў 19.30 17.12.2014 г.

■ Будучым чэмпіёнам

# ЯНЫ ЗДОЛЬНЫЯ НА БОЛЬШАЕ

**Учора прайшла ўрачыстая цырымонія ўручэння імянных пасведчанняў стыпендыятам Прэзідэнцкага спартыўнага клуба на 2015 год**

**У лік 217 стыпендыятаў увайшлі найбольш перспектыўныя юныя беларускія спартсмены, спартсмены-паралімпійцы, а таксама трэнеры-выкладчыкі, якія сёлета дабіліся значных вынікаў, прадстаўляючы краіну на розных прэстыжных міжнародных спаборніцтвах.**

**Старшыня Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА**, уручаючы імянныя пасведчанні, сказаў, што нездарма гэтая ўрачыстая цырымонія праходзіць у Зале алімпійскай славы:

— Выбар гэтага месца не выпадковы. Тут, сярод славутых спартсменаў нашай краіны, мы сустракаем новае пакаленне тых, хто павінен папоўніць шэрагі алімпійцаў. І трэба сказаць, вы ўжо паказалі, што здольныя на многае: за мінулы год цяперашнія стыпендыяты 31 раз станавіліся пераможцамі кантынентальных і сусветных спаборніцтваў у розных узроставых групах.

Таксама Дзмітрый Лукашэнка адзначыў, што амаль трыццаць працэнтаў цяперашніх стыпендыятаў працягваюць удзельнічаць у праекце дзякуючы сваім вынікам. З гэтага года павялічваюцца стыпендыі для тых, хто ў рамках праекта змог замацавацца на высокім узроўні або палепшыць свае вынікі. Стыпендыя ў гэтым выпадку ўзрасце на дзесяць і дваццаць працэнтаў адпаведна.

Стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба таксама павіншавалі памочнік Прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў, намеснік міністра спорту і турызму Часлаў Шульга, алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы Марына Лобач. Яны пажадалі маладому пакаленню беларускіх атлетаў не спыняцца на дасягнутым і пастаянна павышаць свой узровень.

Дарэчы, найбольшая колькасць імянных пасведчанняў стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба ўручаны прадстаўнікам веславання на байдарках і каноэ (24), акадэмічнага веславання (15), веласпорту (11). Запамінальным аказалася і выступленне маладых беларускіх спартсменаў на II летніх юнацкіх Алімпійскіх гульнях у кітайскім Нанкіне, дзе шэсць з васьмі медалістаў з'яўляліся стыпендыятамі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Чэмпіёнкамі сталі Крысціна Старасялец (акадэмічнае веславанне), Каміла Бобр (веславанне на каноэ), Ірына Шымановіч (тэніс, парны разрад), Ганна Тарасюк (лёгкая атлетыка).

Сярэдні памер стыпендыі складзе 3 мільёны 308 тысяч рублёў у месяц (на шэсцьсот тысяч больш у параўнанні з мінулым годам). Стыпендыі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба будуць выплачвацца спартсменам і трэнерам-выкладчыкам на працягу года, пачынаючы са студзеня 2015-га.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**



Дзмітрый Лукашэнка ўручае пасведчанне аб прызначэнні стыпендыі тэнісістцы Алене Дубковай.

■ Не прапусціце!

## Каб у душы музыка гучала

**Снежаньскія музычныя вечары праходзяць у каланнай зале гомельскага палаца Румянцавых-Паскевічаў.**

— Мы штогод імкнёмся падтрымліваць сусветную традыцыю, згодна з якой напярэдадні вялікага хрысціянскага свята ладзяцца такія вечарыны, заклікаца падрыхтаваць душу да Раства Хрыстова. Менавіта класічная музыка дапамагае чалавеку глыбока пагрузіцца ў эмацыянальныя перажыванні і такім чынам ачысціць душу, — паведаміла мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор камернага хору Алена Сакалова.

Сёлета ў святочнай праграме прагучаць творы праваслаўнай рускай духоўнай музыкі, заходнееўрапейская класіка, а таксама рамансы Пятра Чайкоўскага і Георгія Свірыдава.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**


**Извещение**
**о проведении открытого аукциона по продаже зданий и сооружений ОАО «Кричевцементношифер»**

**Начальная цена продажи объекта снижена на 80%**

| |
|---|
| **Лот № 1.** Административно-производственный корпус (цех деревообработки) (инв. № 00110089), асфальтная площадка (инв. № 00220182), изгородь (инв. № 00220068), здание цеха пилорамы (инв. № 00110095), здание гаража (инв. № 00110092), здание металлического склада (инв. № 00110096), здание столярного цеха, здание гаража, наружное освещение (инв. № 00110091), расположенные по ул. Бирюзова, 14 в г. Кричеве. |
| Характеристика объектов: Административно-производственный корпус (цех деревообработки) (инв. № в ЕГРНИ 730/С-185, общая площадь 2990,8 кв.м, объем 19488 куб.м, фундамент бутовый, стены кирпич, перекрытия ж/б, имеются водопровод, канализация, отопление), асфальтная площадка (инв. № в ЕГРНИ 730/С-13317, общая площадь 5472 кв.м), изгородь (инв. № в ЕГРНИ 730/С-13316, забор кирпичный (длина-высота, м) 12,3 х 1,8, 16,5х2,40; забор ж/б плиты 104х2,10; забор металлические прутья 3,2х2,7; ворота металлические длина 6м), здание цеха пилорамы (инв. № в ЕГРНИ 730/С-16260, общая площадь 456,7 кв.м, объем 2926 куб.м, фундамент бетонный, стены панели, перекрытия ж/б), здание гаража (инв. № в ЕГРНИ 730/С-322, общая площадь 238,2 кв.м, объем 1034 куб.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия ж/б), здание металлического склада (инв. № в ЕГРНИ 730/С-16262, общая площадь 187,5 кв.м, объем 802 куб.м, фундамент бетонные тумбы, стены металл, крыша жесть), здание столярного цеха, здание гаража, наружное освещение (инв. № в ЕГРНИ 730/С-353, общая площадь 647,2 кв.м, объем 2632 куб.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия ж/б). |
| Площадь земельного участка 2,1282 га, кадастровый номер 724050100001000161 предоставлен в постоянное пользование, целевое назначение – земельный участок для обслуживания существующих зданий. |
| Объект продается без условий. |
| Начальная цена продажи **951 026 880** (Девятьсот пятьдесят один миллион двадцать шесть тысяч восемьсот восемьдесят) рублей с учетом НДС 20%. |
| Сумма задатка **95 102 688** (Девяносто пять миллионов сто две тысячи шестьсот восемьдесят восемь) рублей. |

Аукцион состоится **30 декабря 2014 г. в 15.00** по адресу: Кричевский район, Краснобудский сельсовет, 2 АБК в районе месторождения «Каменка», актовый зал.

Продавец объекта – ОАО «Кричевцементношифер».

Организатор аукциона – ООО «БелИнвестОценка».

*Задаток перечисляется Организатору аукциона на р/с № 3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.00 по 29.12.2014 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»).** Заключительная регистрация участников 30.12.2014 с 14.00 до 14.45 по месту проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Кричевцементношифер» не позднее 5 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00.

Контактный телефон продавца в г. Кричеве 8 044 715 94 24.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: **belinvo@tut.by**, на сайте belinvo.by.

*Извещение об аукционе напечатано в газете «Звязда» 10.10.2014 № 193 (27803).*


# ШТО НОВАГА Ў АЙЧЫННЫХ ВЫДАВЕЦТВАХ?

**Падзеі Вялікай Айчыннай вайны, князі Радзівілы і творы Караткевіча без купюр...**

**Напрыканцы адыходзячага года выдаўцы сабраліся разам, каб прыгадаць тое самае лепшае і цікавае, што было выдадзена сёлета, а таксама падзяліцца планамі на будучыню.**

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» традыцыйна парадавала сваіх чытачоў перавыданнямі класічнай літаратуры. Завяршылася работа над зборам твораў Івана Шамякіна і зусім хутка, перад Новым годам, выйдзе яго 23-ці том. За мінулы час у выдавецтве пабачылі свет сем тамоў нашага ўлюбёнага класіка — Уладзіміра Караткевіча, на наступны год плануецца яшчэ чатыры. Нарэшце творы майстра гістарычнай прозы паўстануць у такім выглядзе, у якім калісьці былі напісаны аўтарам (у пэўны час цэнзурай рабіліся істотныя купюры ў яго тэкстах), адзначыў **галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП.**

**Галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Ларыса ЯЗЫКОВІЧ** расказала, што ў іх выходзіць шматтомная энцыклапедыя «Гарады і вёскі Беларусі», якая з'яўляецца ўнікальнай не толькі для Беларусі, але і для ўсёй постсавецкай прасторы. Ужо выйшлі тамы, прысвечаныя Брэсцкай і Гомельскай абласцям. Сёлета скончылі работу над энцыклапедыяй, прысвечанай Мінскай вобласці.

У якасці святочнага падарунка галоўны рэдактар вельмі раіць набываць «Вялікую энцыклапедыю Вялікага тэатра Беларусі». У кнізе адлюстравана жыццё тэатра, пачынаючы ад 1933 года, калі ён быў створаны, і да нашых дзён. У алфавітным парадку змешчана больш за 600 артыкулаў, у якіх апісаны самыя розныя аспекты тэатральнага жыцця: гэта і праблемы сучаснага тэатра оперы і балета, і пастаноўкі гэтага тэатра, і самыя яскравыя гастролі, і многае іншае.

**Загадчык літаратурнай рэдакцыі выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН** прэзентаваў кнігу пра Радзівілаў: «Радзівілы. Нясвіж. Замак». Яе напісала доктар мастацтвазнаўства Надзея Высоцкая. Яна шмат гадоў вывучала старажытны род. У кнізе змяшчаюцца як архіўныя матэрыялы (шмат фотаздымкаў, якія паказваюць, як раней выглядаў Нясвіжскі замак — у той час, калі там жылі самі Радзівілы), а таксама выявы сучасныя, у тым ліку зробленыя падчас рэстаўрацыі.

Працягваецца і выданне серыі кніг нашага вядомага даследчыка, этнографа Анатоля Федарука. Толькі-толькі пабачыла свет яго новая кніга, прысвечаная сядзібам Гродзеншчыны. Рэдактары адзначаюць, што і не думалі, што па нашых сядзібах захавалася столькі цікавага матэрыялу.

**Загадчыца аддзела навукова-папулярнай літаратуры Выдавецкага дома «Звязда» Наталля КАРАСЁВА** падзялілася планамі на 2015 год і адзначыла, што многае робіцца для захавання памяці пра Вялікую Айчынную вайну: «Захоўваем і памятаем» — пад такой назвай створаецца кніжны гід па залах музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У ім будуць размешчаны матэрыялы не толькі пра экспазіцыі, прызначаныя для шырокага кола наведвальнікаў, але і прадстаўлены асобныя экспанаты з фондаў захоўвання. Альбом стане своеасаблівым сімвалам захавання памяці пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, паспрые павелічэнню колькасці наведвальнікаў гэтага музея.

